КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ
_______________ А.В. Макоўчык
«20» 09 _______ 2021 г.
Рэгістрацыйны № УД-30-01-88-2021/вуч.

# МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці:
1-03 01 08 Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура

2021 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 1-03 01 07-2016, зацверджанага 25.07.2016 г., рэгістрацыйны № 69 і вучэбнага плану па спецыяльнасці

СКЛАДАЛЬНІКІ:
Ю.Ю.Захарына, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", доктар мастацтвазнаўства, дацэнт;
М.А.Шатарава, старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

САГЛАСАВАНА:
Дырэктар ДУО «СШ №207 г. Мінска» К.П.Саўчук

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
С.І. Колбышава, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук;
А.І. Лакотка, дырэктар дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай тэорыі і методыкі выкладання мастацтва
(пратакол № 8 ад 19.03.2021 г.);
Загадчык кафедры Ю.Ю.Захарына

Навукова метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 5 ад 20.04. 2021 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзейнічаючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ
А.А. Краўчанка

Директор библиотеки Н.П.Сятковская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі”

Вучэбная дысцыпліна “Мастацкая культура Беларусі” разглядае сукупнасць каштоўнасцей, створаных у розных відах мастацтва (выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, архітэктуры), як арганічнае адзінства ў яго супастаўленні з агульна-гістарычным працэсам развіцця культуры Беларусі. Асаблівая ўвага звяртаецца на супольнасць прынцыпаў творчасці ў розных відах мастацтва, узаемасувязь відаў і жанраў мастацтва ў розныя гістарычныя перыяды, цэласнасць і непаўторнасць мастацкай культуры Беларусі. У працэсе вывучэння эвалюцыі мастацкай культуры Беларусі студэнты атрымліваюць абагуленае ўяўленне аб мадэлі развіцця і трансфармацыі гісторыка-мастацкіх каштоўнасцей, працэсаў, мастацка-вобразных сістэм.

За апошнія гады айчынныя мастацтвазнаўства і культуралогія ўзбагаціліся новым зместам. Маштабныя даследаванні, звязаныя з праблемамі стылю, мастацкага вобраза, кампазіцыі, ансамбля, каларыстыкі, дазволілі вылучыць найбольш істотныя і значныя аспекты ў галіне мастацкай культуры, вызначылі канцэпцыі і метадалогію вывучэння мастацкай культуры, далі цэласнае ўяўленне аб гісторыі развіцця мастацтва Беларусі ад вытокаў да сучаснасці.

Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі” – павышэнне ўзроўню гісторыка-мастацкай кампетэнтнасці.

Задачы:

1. авалоданне студэнтамі мастацтвазнаўчай тэрміналогіяй;
2. асваенне студэнтамі ведаў аб эвалюцыі мастацкіх стыляў, кірункаў, іх характэрных асаблівасцях, аб творчасці буйнейшых мастакоў, архітэктараў Беларусі;
3. фарміраванне навыкаў аналізу мастацкіх твораў;
4. развіццё ўменняў вылучаць традыцыйныя і наватарскія рысы ў мастацтве Беларусі асноўных гістарычных перыядаў.

Выкладанне і паспяховае вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі” ажыццяўляецца на базе набытых студэнтам ведаў і ўменняў па раздзелах наступных дысцыплін:

Гісторыя музыкі. Сусветная мастацкая культура.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асабістых і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый

Студэнт павінен:

– АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

– АК-2. Валодаць метаамі навукова-педагагічнага даследавання.

– АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

– АК-4. Умець працаваць самастойна.

– АК-5. Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

– АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

– АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

– АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

– АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Патрабаванні да сацыяльна-асабістых кампетэнцый

– СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабістых камунікацый.

– СЛК-5. Быць здольнымі да крытыкі і самакрытыкі.

– СЛК-6. Умець працаваць у камандзе.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый

– ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнаваўчай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

– ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

– ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.

– ПК-4. Арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў.

– ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканальвання прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі” студэнт павінен

**ведаць**:

- асноўныя этапы развіцця мастацтва Беларусі і іх характарыстыку;
- асаблівасці праяў агульнаеўрапейскіх мастацкіх стыляў ў беларускім мастацтве;
- нацыянальную спецыфіку мастацтва Беларусі;
- творы буйных беларускіх архітэктараў, скульптараў, графікаў, жывапісцаў, мастакоў прыкладной творчасці;
- асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснага мастацтва Беларусі;
- дасягненні ў айчынным мастацтве;

**умець:**

- аналізаваць творы мастацтва Беларусі і вылучаць нацыянальную спецыфіку;
- вызначаць паслядоўнасць станаўлення і развіцця стыляў і кірункаў у мастацтве Беларусі;

**валодаць**:

- навыкамі культурна-асветніцкай дзейнасці.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі” згодна вучэбнаму плану спецыяльнасці адводзіцца 358 акадэмічных гадзін. З іх для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі адведзена 142 аўдыторныя гадзіны (70 – лекцыйных, 72 – семінарскіх, у тым ліку 6 лекцыйных і 8 семінарскіх – на кіруемую самастойную работу). На самастойную работу студэнтаў адведзена 144 гадзіны.

Аўдыторныя гадзіны для дзённай формы атрымання адукацыі размяркоўваюцца наступным чынам:

1 курс 2 семестр – усяго 36 гадзін (20 – лекцыйных (з іх 2 гадзіны – на кіруемую самастойную работу), 16 – семінарскіх, (з іх 2 гадзіны – на кіруемую самастойную работу));

2 курс 3 семестр – усяго 16 гадзін (8 – лекцыйных, 8 – семінарскіх), залік;

2 курс 4 семестр – усяго 36 гадзін (16 – лекцыйных, 20 – семінарскіх);

3 курс 5 семестр – усяго 20 гадзін (10 – лекцыйных (з іх 2 гадзіны – на кіруемую самастойную работу), 10 – семінарскіх, (з іх 2 гадзіны – на кіруемую самастойную работу)), экзамен;

3 курс 6 семестр – усяго 34 гадзіны (16 – лекцыйных (з іх 2 гадзіны – на кіруемую самастойную работу), 18 – семінарскіх, (з іх 4 гадзіны – на кіруемую самастойную работу)), экзамен.

Асноўнымі формамі заняткаў пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны “Мастацкая культура Беларусі” з’яўляюцца:

- лекцыйныя заняткі;
- семінарскія заняткі.

Бягучы кантроль ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі ажыццяўляецца ў форме рэйтынгавых кантрольных работ. Формы рэйтынгавых кантрольных работ па вучэбнай дысцыпліне “Мастацкая культура Беларусі” – пісьмовыя кантрольныя работы, тэсты, работа с тэкстамі і ілюстратыўнымі матэрыяламі. Заданні па рэйтынгавым кантрольных работ прадстаўленыя ў фондзе ацэначных сродкаў па вучэбных дысцыплінах кафедры.

Бягучая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці дзённай формы атрымання адукацыі ў форме заліку в 3 семестры, экзаменаў – у 5 і 6 семестрах.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел 1. Тэарэтычныя аспекты мастацкай культуры Беларусі

### Тэма 1.1 Мастацтвазнаўства як навука

Беларускае мастацтвазнаўства – адносна маладая галіна навукі. Першыя спробы мастацтвазнаўчага аналізу творчасці мастакоў XIX ст. (К.Ельскі, А.Ромер, У.Сыракомля і інш.). Мастацтвазнаўства Беларусі ў паслярэвалюцыйны час: даследванні М.Шчакаціхіна. Развіццё мастацтвазнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны. Стварэнне ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Эмпірычны падыход у даследаваннях мастацтва 1960-х гг. Даследванні М.Кацара, Л.Дробава, П.Масленікава, А.Воінава, У.Чантурыі. Пашырэнне навуковага і кадравага патэнцыялу ў галіне мастацтвазнаўства ў 1970–1980-я гг.

### Тэма 1.2 Сучаснае мастацтвазнаўства Беларусі

Росквіт айчыннага мастацтвазнаўства ў 1990 – 2000-я гг. Грунтоўныя выданні па гісторыі мастацтва як тэарэтычная база вывучэння мастацкай культуры Беларусі: “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі” ў 7 тамах (1984–1988 гг.), “Гісторыя беларускага мастацтва” ў 6 тамах (1987–1994 гг.). Пытанні гісторыі і тэорыі беларускага мастацтва ў часопісах “Мастацтва Беларусі” (пазней – “Мастацтва”), “Архитектура и строительство”, “Роднае слова”, альманаху “Запіскі Беларускай акадэміі мастацтваў”, газетах “Лістаратура і мастацтва”, “Культура”, перыядычным друку, навуковых зборніках. Навуковыя публікацыі В.Аладава, М.Баразны, А.Воінава, Н.Высоцкай, Т.Габрусь, В.Гаўрылава, Л.Дробава, В.Жука, Ю.Захарынай, П.Карнача, М.Кацара, Н.Кожар, А.Кулагіна, А.Кушнярэвіча, А.Лакоткі, Г.Лаўрэцкага, А.Лявонавай, П.Масленікава, Э.Петэрсона, М.Раманюка, Я.Сахуты, С.Сергачова, М.Ткачова, А.Трусава, У.Чантурыі, Ю.Чантурыі, Т.Чарняўскай, В.Шматава, А.Шамрук, Ю.Якімовіча, М.Яніцкай і іншых па пытаннях горадабудаўніцтва і архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

## Раздзел 2. Мастацтва Беларусі ў старажытны перыяд

### Тэма 2.1 Архітэктура Беларусі ў старажытны перыяд

Старажытныя паселішчы і гарадзішчы. Першыя архітэктурныя формы: іх характар, функцыі, знешняе аблічча. Рэшткі паслелішчаў позняга палеаліту: жыллё з выкарыстаннем касцей мамантa каля вёсак Бердыж Чачэрскага раёна і Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. Неалітычнае жыллё-паўзямлянка круглай у плане формы. Першая прамысловая архітэктура – крэмневыя шахты. Спецыфіка такога мінеральнага ўтварэння як крэмень у якасці экспартнага прадукту. Геаграфія размяшчэння старажытных крэмневых шахт. Шахты і звязаныя з імі майстэрні па апрацоўцы здабытага каменя. Апрацоўка крамянёвай сыравіны ў старажытных шахтах і майстэрнях. Двухкамернае жыллё бронзавана веку прамавугольнай у плане формы з

двухсхільным дахам. Гарадзішчы жалезнага веку. Формы гарадзішчаў жалезнага веку: трохвугольная, авальная, круглая, чатырохвугольная. Канструкцыя сцен старажытных пабудоў: пляцень, абмазаны глінай.

**Тэма 2.2 Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі ў старажытны перыяд**

Першыя формы мастацкай дзейнасці эпохі верхняга палеаліту: упрыгожванні ў форме арнаментаваных падвесак з біўня маманта, зубоў і касцей жывёл. Керамічныя пасудзіны эпохі палеаліту. "Палеалітычныя Венеры" – каменныя і касцяныя скульптурныя фігуркі, звязаныя з першабытнымі вераваннямі і культамі. Адлюстраванне магічных і прасторава-часавых уяўленняў першабытных часоў у дэкоры утылітарных прадметаў эпохі мезаліту. Геаметрызаваныя антрапаморфныя і зааморфныя выявы на косці і гліняных пасудзінах эпохі неаліту. Упрыгожванні з бурштыну. Упрыгожванні бронзавага і жалезнага вякоў (дыядэмы, пярсцёнкі, бранзалеты, скроневыя кольцы, шкляныя пацеркі, завушніцы, фібулы): іх арнаментацыя (ямкі, трохвугольнікі, елкі, салярныя сімвалы і інш.). Кераміка жалезнага веку: Днепра-Дзвінская культура (Фіна-Угорскае паходжанне плямёнаў); Мілгарадска-Зарубінецкая культура (Скіфскае паходжанне); Штрыхавая культура (Балцкае паходжанне); Паморская культура (Гоцкае паходжанне). Тэхніка керамічных вырабаў. Формы керамікі: гаршкі (для прыгатавання гарачай ежы), збаны (для вадкасцяў), амфары (для перавозу прадуктаў), міскі, кубкі, слоікі (для засолкі агуркоў, захаванняварэння), дуршлакі і інш. Вырабы з медзі, бронзы, железа, золата і серабра ў жалезным веку. З'яўленне каляровай эмалі ў пачатку н.э. З'яўленне манументальнай скульптуры ў пачатку н.э.: каменныя валуны з прыроднымі рэльефамі, скульптурныя антрапаморфныя слупы з каменя і дрэва.

## Раздзел 3. Мастацтва Беларусі IX–XIII стст.

**Тэма 3.1 Архітэктура Беларусі IX–XIII стст.**

IX–XIII стст. – перыяд дзяржаўных утварэнняў: Тураўскае, Полацкае, Смаленскае княствы. Фарміраванне старажытных гарадоў на аснове гарадзішчаў жалезнага веку (Полацк, Віцебск, Лукомль і інш.). Структура горада: *дзядзінец*, абнесены абарончымі ўмацаваннямі, *вакольны горад* з другой лініяй валоў, *пасад* (неўмацаванае паселішча) або прадмесце, гарадскі курганны ці бескурганны *некропаль*, загарадныя *манастыры* (з прыняццем хрысціянства). Радыяльна-кальцавая або радыяльна-веерная планіроўка гарадоў. Драўлянае будаўніцтва: жыллё, знешнія ўмацаванні, масты, вежы, гарадскія сцены. Бярвенчатае брукаванне вуліц. З'яўленне ў XI ст. новых будаўнічых матэрыялаў: плінфа, плітка для падлогі, вапна, цамянка, аконнае шкло, свінцовыя лісты для пакрыцця дахаў.

Усходні (візантыйскі) і заходнееўрапейскі ўплыў на беларускае мастацтва. Першыя агульнаеўрапейскія стылі ў беларускім дойлідстве: раманскі і гатычны.

Культавае дойлідства. Полацкі Сафійскі сабор (сярэдзіна XI ст.) – адна з першых пабудоў культавай архітэктуры Беларусі: візантыйскі ўплыў і нацыянальныя асаблівасці.

Першыя нацыянальныя архітэктурныя школы: Полацкая і Гродзенская (XII ст.): іх характэрныя асаблівасці. Творчасць дойліда Іаана – галоўнага прадстаўніка Полацкай школы (Барысаглебская царква ў Навагрудку. Замкавая царква ў Мінску, цэрквы ў Ноўгарадзе і Смаленску). Асаблівасці кампазіцыі і дэкаратыўнага аздаблення помнікаў Гродзенскай школы (Спаса-Прэабражэнскі манастыр, Барысаглебская царква ў Гродне).

Абарончыя збудаванні XIII ст. Вежы-данжоны ў Полацку, Брэсце, Тураве, Гродне, Навагрудку. Творчасць дойліда Алекса. «Белая» (Камянецкая) вежа.

**Тэма 3.2 Выяўленчае мастацтва Беларусі IX–XIII стст.**

Фрэскавы жывапіс XI – XII стст. Роспісы Полацкага Сафійскага сабора, Спаса-Прэабражэнскай царквы і Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку. Мастацтва афармлення рукапісаў: мініяцюры, буквіцы, застаўкі, канцоўкі. Тэраталагічны або “звярыны” стыль у афармленні рукапісаў (“Аршанскае евангелле”, XIII ст.). Фарміраванне Полацка-Смаленскай школы мініяцюрнага жывапісу (XII–XIII стст.): Служэбнік Варлаама Хутынскага з выявамі Васіля Вялікага і Іаана Златавуста на залатым фоне; Універсітэцкае, Полацкае евангеллі. Пластыка эпохі ранняга Сярэднявечча. “Каменныя бабы” з вёсак Залуззе і Грабаўцы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобл. Рэшткі ідалаў: слонімскі, невельскі двулікі, шклоўскі. Іканапіс. Тэхніка пісання старажытных ікон. Візантыйскія цудатворныя іконы Божай Маці на Беларусі: Полацкая Эфеска-Карсунская Адзігітрыя, Смаленская Адзігітрыя (XI ст.). Дарагабужская Адзігітрыя – найбольш старажытны захаваны помнік іканапісу палескавалынскага памежжа (мяжа XIII – XIV стст.).

**Тэма 3.3 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі IX–XIII стст.**

Эвалюцыя керамічных вырабаў: разнастайнасць іх форм. Засваенне новых тэхнік: каляровая паліва, эмаль, ангоб. “Абварная” (“рабая”) кераміка. Апрацоўка металаў і ювелірная справа. Крыжы-энкалпіёны. Пашырэнне тэхнікі коўкі з чорных металаў, здабытых з мясцовай балотнай руды (прадметы быту, зброя, дэталі конскай вупражы з упрыгожваннем насечкай, чаканкай, інкрустацыяй). Крыж Ефрасінні Полацкай (ювелір Лазар Богша, 1161 г.) – шэдэўр беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: сімволіка і сістэма аздаблення, тэхнікі разьбы па дрэве, інкрустацыі, перагародчатая эмаль. Лёс Крыжа Ефрасінні Полацкай, яго ўзнаўленне ў 1997 г. М.Кузьмічом.

## Раздзел 4. Мастацтва часоў Сярэднявечча і Адраджэння (XIV–XVI стст.)

**Тэма 4.1 Архітэктура Беларусі XIV–XVI стст.**

Захаванне ўсходнееўрапейскага тыпу планіроўкі гарадоў. Фарміраванне замкаў з функцыяй цэнтра горада. Змены ў планіроўцы гарадоў XV ст. Гандлёвая плошча з ратушай як новы цэнтр горада. Узвядзенне брамаў у

пачатку вуліц, што пераходзілі ў сувязныя дарогі паміж горадам і наваколлем (нясвіж, Быхаў). Замацаванне радыяльна-кальцавой сістэмы планіроўкі гарадоў (Пінск, Магілёў). Мястэчкі як дробныя паселічшы гарадскога тыпу.

Абарончыя замкі: іх характэрныя рысы (Навагрудскі, Лідскі, Крэўскі, Гродзенскі). Мірскі замак: асаблівасці планіроўкі і канструкцыі, этапы будаўніцтва. Нясвіжскі замак – жамчужына беларускага дойлідства.

Культавае дойлідства. Нацыянальныя рысы архітэктуры на аснове зліцця структуры руска-візантыйскага крыжова-купальнага храма і кампазіцыйна-канструкцыйных прыёмаў мясцовага замкавага дойлідства. Царква абарончага тыпу (царква-крэпасць), яе асаблівасці: кампактныя ў плане, блізкія да прамавугольніка аб'ёмы, фланкіраваныя па вуглах баявымі вежамі з байніцамі; высокі клінападобны дах з гатычнымі нервюрнымі скляпеннямі; арачныя нішы розных тыпаў на фасадах; паліхромія, пабудаваная на спалучэнні чырвонага і белага колераў. Асноўныя помнікі: Супрасльская царква-крэпасць (Беластоцкае ваяводства, Польшча), Ішкальдскі Троіцкі касцёл (Баранавіцкі раён, Брэсцкая вобл.), Сынкавіцкая царква-крэпасць (Зэльвенскі раён, Гродзенская вобл.), Маламажэйкаўская (Мураванкаўская) царква-крэпасць (Шчучынскі раён, Гродзенская вобл.), Навагрудская Барыса-Глебская царква, касцёл Святога Міхаіла Архангела ў Гнезна (Гродзенская вобл.).

Спецыфіка архітэктуры беларускага Рэнесанса: буйнамаштабныя формы з малым выкарыстаннем архітэктурных дэталяў, шчыпцовы дах, спалучэнне чырвонага і белага ў дэкаратыўным аздабленні. Асноўныя помнікі: Замкавая вежа ў Нясвіжы, Мірскі замак, храм у Смаргоні Гродзенскай вобл., Праабражэнская царква ў Заслаўі.

**Тэма 4.2 Выяўленчае мастацтва Беларусі XIV–XVI стст.**

Развіццё фрэскавага жывапісу. Асаблівасці сюжэту і кампазіцыі. Трактоўка вобразаў святых і прарокаў. Народны характар тыпажу. Лінія – асноўны сродак выразнасці ў фрэскавым жывапісу Сярэднявечча. Асаблівасці каларыстыкі. Іканапіс. Імкненне да канкрэтызацыі і рэальнасці ў абранні выяўленчых матываў. Графічная мадэліроўка форм. Светлы каларыт і сістэма арнаментацыі фонаў. Іконы Пінскага Палесся (XVI ст.): “Успенне”, “Маці Божая Перыўлепта (Іерусалімская)”, “Спас Пантакратар”. Уплыў рэнесансу ў абразах “Спас” з Быценя, “Праскева Вялікапакутніца” са Случчыны. Свецкі жывапіс. Партрэтнае мастацтва. Партрэты Кацярыны Слуцкай, віленскага біскупа Ежы Радзівіла. Скульптурны партрэт двух тыпаў: медальернае мастацтва і надмагільныя помнікі. Дзейнасць італьянскіх майстроў па аздабленні надмагілляў, вырабу манет і медалёў: Ф.Фларэнціец, Б.Берэчы, Дж.М.Моска (Падавана), Б.З. дэ Джыяноціс. Драўляная скульптура. Мастацтва мініяцюры. Афармленне евангелляў, летапісаў, псалтыроў (Лаўрышаўскае, Мелішаўскае, Жыровіцкае, Шарашоўскае евангеллі). Мініяцюры Радзівілаўскага (Кёнігсбергскага) летапісу. Народны тыпаж выяўляемых. Дынаміка і рух кампазіцый. Фарміраванне асноўных відаў, жанраў і тэхнік беларускай графікі. Развіццё кнігадрукавання. «Псалтыр» Ф.Скарыны. Тэхніка

афармлення кніг («Песня Песняў» Ф.Скарыны). Кінавар. Гравюра на медзі. Творчая дзейнасць Т.Макоўскага.

**Тэма 4.3 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XIV–XVI стст.**

Узнікненне рамесных аб'яднанняў заходнееўрапейскага тыпу – цэхаў. Ювелірнае майстэрства: упрыгожванні, бытавы і літургічны посуд, абклады кніг і абразоў з каштоўных і каляровых металаў з ужываннем тэхнік чаканкі, ліцця, коўкі, гравіроўкі, чарнення, эмалі. Арнаментыка керамічных вырабаў: раслінныя, геральдычныя, геаметрычныя матывы. Узнікненне цэнтраў па вырабу шкла: Брэст, Шыдлоўцы, Орша, Полацк і інш. "Дубальтовыя кубкі". Удасканальванне тыпаў і форм пасудзін. Драўляная мэбля беларускага Рэнесансу.

## Раздзел 5. Мастацтва беларускага барока

### Тэма 5.1 Архітэктура беларускага барока

Рэфармацыя і Контррэфармацыя на Беларусі. Дзейнасць Радзівілаў. Зараджэнне новага стылю – барока. Творчасць італьянскага архітэктара Яна Марыі Бернардоні. Касцёл Божага Цела (Фарны) у Нясвіжы – першы твор у стылі барока на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Перыядызацыя беларускага барока: ранняе, сталае і позняе барока. Культавае дойлідства беларускага барока. Росквіт каталіцкага дойлідства. Ранняе барока: касцёл Адшукання Святога Крыжа ордэна бернардзінцаў і Дабравешчанскі касцёл ордэна брыгітак у Гродна. Сталае барока: асаблівасці архітэктурна-планіровачнай структуры і дэкаратыўнага аздаблення. Касцёл Святога Міхаіла Архангела ордэна аўгусцінцаў у Міхалішках, царква Святога Мікалая ў Магілёве, касцёл Святога Францыска Ксаверыя ордэна езуітаў у Гродна, касцёл Святога Іосіфа ордэна бернардзінцаў у Мінску. Пінскі калегіум – яскравы помнік архітэктуры барока. Адметныя асаблівасці сістэмы "віленскага барока": дынамічныя формы фасадаў, фігурныя шчыты і хвалістыя лініі. Кафедральны Свята-Духаў сабор у Мінску, касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі езуіцкага ордэна ў Мінску, сабор Нараджэння Багародзіцы і Троіцкі касцёл ў Глыбокім, касцёл Святога Міхаіла Архангела ордэна францысканцаў у Івянцы, касцёл Святога Мікалая ордэна даменіканцаў ў Княжыцах, касцёл Святога Андрэя ў Слоніме. Творчасць архітэктара Я.К. Глаўбіца: Полацкі Сафійскі сабор, праекты касцёлаў Святога Казіміра, Святога Яна ў Вільні, Спаская царква ў Магілёве. Позняе барока ў культавым будаўніцтве, яго асаблівасці: касцёл Святога Станіслава ордэна кармелітаў у Магілёве, касцёл Унебаўзняцця Панны Марыі ордэна бернардзінцаў у Будславе, Петрапаўлаўскі касцёл у Барунах, касцёл Святога Міхаіла Архангела ў Лужках.

Драўляная культавая архітэктура барока XVIII ст. Дзве асноўныя тэндэнцыі развіцця: кансерватыўная (устойлівае захаванне мясцовых традыцый) і наватарская (адлюстроўвала працэс укаранення эстэтычных канцэпцый афіцыйных стыляў). Чатыры асноўныя кампазіцыйныя тыпы драўляных

хрысціянскіх храмаў: падоўжна-восевы (Мікітаўская царква ў Здзітава Жабінкаўскага раёна, Царква Святога Іллі ў Гомелі), цэнтрычны (царква Пакрава Прасвятой Багародзіцы ў Дунайчыцах Нясвіжскага раёна), глыбінна-прасторавы (Увядзенская і Уваскрасенская цэрквы ў Віцебску – не захаваліся) і крыжовы (Ільінская і Троіцкая цэрквы ў Віцебску – не захаваліся, царква Святога Міхаіла ў Рубелі, царква Святога Георгія ў Давыд-Гарадку, царква Святога Мікалая ў Кажан-Гарадку, сабор Святога Міхаіла Архангела ў Слуцку).

Інтэнсіўнае развіццё гарадоў. Будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў. Змены ў горадабудаўніцтве. Ускладненне архітэктурна-планіровачнай структуры гарадоў, змены характару абарончых збудаванняў. Роля гандлёвай плошчы як цэнтра планіровачнай структуры горада. Радыяльная і рэгулярная сістэмы планіроўкі.

Барока ў архітэктуры грамадскіх будынкаў. “Дом на рынку” і ратуша ў Нясвіжы, Магілёўская ратуша і інш. Палацава-замкавае дойлідства. Гальшанскі і Смалянскі замкі, Палац Тызенгаўза, Новы замак у Гродне, замак Сапегаў у Ружанах, палацы Агінскіх у Слоніме, Радзівілаў у Дзятлаве, Валовічаў у Свяцку і інш. Інтэр'еры віленскага барока: паўкруглая і авальная форма залаў, маскіроўка вуглоў печамі, вертыкальныя крывалінейныя панэлі, філёнчатыя дзверы, пазалота, люстэркі. Уклад у развіццё палацава-замкавага дойлідства архітэктараў саксонскай (М.Д. Пёпельман, І. Яўх, Я.С. Бекер) і італьянскай (А. Гену) школ.

Садова-паркавае мастацтва. Паркі двух відаў: французскі рэгулярны і англійскі. Парк Радзівілаў у Нясвіжы, Гродзенскі парк.

**Тэма 5.2 Выяўленчае мастацтва беларускага барока**

Імкненне да сінтэзу, арганічнага спалучэння ў адным ансамблі сродкаў розных відаў мастацтва, асэнсавання мастацкага асяроддзя як складанага адзінства багатых прасторавых кампазіцый. Спалучэнні насценных размалёвак з лепкай са стука, іканапісу – з разьбой па дрэве, пазалотай і чаканкай. Аздабленне алтароў: алтары касцёлаў у вёсцы Воўпа Ваўкавыскага раёна, Узнясення Марыі ў вёсцы Будслаў Мядзельскага раёна (майстар П.Грэмель). Вядучая роля скульптуры ў выяўленчым мастацтве барока. Комплексы разьбяных драўляных алтароў Гродзенскага Езуіцкага і Пінскага Францысканскага касцёлаў. Тыповыя сюжэты скульптуры: выявы Божай Маці і Іаана Багаслова ў смутку каля крыжа, фігуры Георгія Пераможцы, архангела Міхаіла, святых Казіміра і Станіслава, Хрыста ў пакутах, скульптуры-алегорыі (хрысціянскіх дабрачыннасцей, 4 кантынентаў і інш.). Дэкаратыўная і мемарыяльная скульптура. Надмагіллі (Сіроткі ў Фарным касцёле ў Нясвіжы, віцебскага кашталяна Міколы Вольскага і яго жонкі Барбары ў Фарным касцёле ў Навагрудку).

Іканастасы барока: багацце і пышнасць дэкаратыўнай аздобы, ужыванне пазалоты. Іканастасы Успенскай царквы Жыровіцкага манастыра і Магілёўскай Мікалаеўскай царквы. Дэкаратыўнае аздабленне царскіх варот: эвалюцыя ад плоскасных рэльефных узораў (Юр’еўская царква ў Віцебску) да гарэльефных з

багатым ажурным дэкорам і жывапіснымі клеймамі (Сафійскі сабор у Полацку, Спаса-Прэабражэнскі сабор у Магілёве, Троіцкі касцёл у Ружанах).

Познебарочныя храмавыя роспісы. Выкарыстанне прынцыпа "квадратур" (з ілюзіяй глыбіні кампазіцыі сродкамі перспектыўнага скарачэння архітэктурных куліс). Размалёўка Нясвіжскага касцёла Божага Цела (мастак К.Д.Гескі).

Станковы жывапіс. Сармацкі партрэт як аснова шляхецкай галерэі, абавязковая дэталь пахавальнай цырымоніі. Адлюстраванне мадэлі ў касцюме паводле нацыянальнай моды ў стандартнай застылай позе. Зварот увагі ў партрэтным мастацтве на дэталі адзення, антуража. Падкрэсленне саслоўнай прыналежнасці. Радзівілаўская калекцыя сармацкіх партрэтаў. Нясвіжскі "партрэтны збор" (мастак Ю.К.Гескі) – партрэты каралёў і знатных асоб. Партрэты віленскага мастака Б.Стробеля (партрэты Я.Радзівіла, Уладзіслава IV, У.Д.Астрожскага).

Кніжная і станковая гравюра. Тэхнікі дрэварыт і медзярыт. Творчасць магілёўскіх майстроў В.Вашчанкі, Ф.Ангілейка, А.Пігарэвіча. Творчасць віленскіх майстроў-гравёраў: К.Гётке, Л.Вілатц, Л.Кршчановіч, І.Шчырскі. Металагравюра ў творчасці братоў А. і Л.Тарасевічаў з Глуска: тытульныя гравюры і складаныя шматфігурныя цыклы ілюстрацый, партрэтна-эмблематычныя кампазіцыі і адлюстраванні цудатворных абразоў Божай Маці. Яскравыя помнікі беларускай барочнай металагравюры: "Партрэт мінскага харунжага К.Клакоцкага" А.Тарасевіча (1685 г.), "Партрэт ашмянскага прыстольніка Г.Зямлі" (1680 – 1690-я гг.), тытульная ілюстрацыя Л.Тарасевіча да "Служэбніка", выдадзенага супрасльскай базыльянскай друкарняй (1695 г.).

**Тэма 5.3 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларускага барока**

Творчасць беларускіх цанінікаў у Маскве (Ігнат Максімаў з Копысі, Пётр Заборскі, Сцяпан Іваноў ("Полубес") з Мсціслава, Павел Буднееў, Драфейка, Якаў Андрэеў, Савелій Аляксееў, Пётр Фёдараў з Копысі і інш.). Аздабленне фрызаў і калон. Кампазіцыя "Вока паўліна" на сценах царквы Георгія Неакесарыйскага. Фрызы сабораў Новаерусалімскага, Іосіфа Варкаламскага манастыроў. Керамічнае пано з выявамі 4-х евангелістаў на барабане царквы Успення ў Ганчарах у Маскве.

З'яўленне ткацкіх мануфактур ў XVII – пачатку XVIII стст. Габеленная тэхніка ў вытворчасці шпалер. Карэліцкія габелены: "Мікалай Радзівіл Чорны ў 1564 г." (прыняў ад імя караля Зігмунда Аўгуста пашану ад Царскіх паслоў); "Прысяга на вернасць каралю Жыгімонту Аўгусту і яго шлюб з Барбарай Радзівіл"; "Наданне тытулу князя Св.Рымскай Імперыі Мікалаю Радзівілу Чорнаму імператарам Карлам-V у 1547 г."; "Каранацыя Барбары Радзівіл"; "Пацверджанне княжскага тытулу на Сейме ў Пёрткале"; "Бітва князя Януша Радзівіла пад Кіевам"; "Бітва пад Мазыром"; "Агляд войскаў пад Заблудавым" і інш. Слуцкія паясы. Мануфактура Яна Маджарскага. Двухбаковыя чатырохлікавыя паясы. Літыя паясы.

Урэцка-Налібоцкае шкло: асартымент (падсвечнікі, бакалы, келіхі, бутэлькі, шклянкі, сталовыя сервізы), стылістычнае вырашэнне, тэхнікі.

## Раздзел 6. Беларускае мастацтва канца XVIII – XIX стагоддзяў

### Тэма 6.1 Архітэктура беларускага класіцызму

Станаўленне класіцызму ў канцы XVIII ст. Развіццё стылістыкі ад барочнага класіцызму да строгага стылю. Уплыў Варшавы на станаўленне стылю класіцызм. Творчасць архітэктара Дж.Сака (каралеўскія палацы ў наваколлі Гродна ў Станіславе, Аўгустове, Панямунь). Творчасць дойліда І.Бэкера (перабудова палаца А.Сапегі, уніяцкая царква ў Ружанах). Строгі стыль у творчасці К.Спампані: прамавугольныя ў плане храмападобныя дамы з антычнымі порцікамі (Беніца, Кухцічы, Радзівілімонты). Росквіт палаца-паркавага мастацтва. Палац у Снове, палаца-паркавыя комплексы ў вёсцы Залессе, Румянцава-Паскевіча ў Гомелі, Тышкевіча ў Лагойску, дом-сядзіба В.Ваньковіча. Інтэр'еры класіцызму: змены анфіладнай планіроўкі на калідорную, манументальныя роспісы, абіўкі сцен, зімовыя сады.

Змены ў горадабудаўніцтве. Увядзенне рэгулярнай сістэмы планіроўкі гарадоў (Віцебск). Дарожна-транспартнае будаўніцтва: чыгункі, «гасцінцы» – гандлёвыя дарогі міжнароднага значэння. Уплыў рускіх дойлідаў на беларускую архітэктуру. Горадабудаўнічае развіццё Мінска. Закладка Гарадскога парка. Вызначэнне галоўнай восі горада – вул.Захар'еўская і галоўнай плошчы. Архітэктура Верхняга горада. Мінскія прадмесці: Камароўка, Ляхаўка, Траецкае, Ракаўскае, Татарская слабада.

Развіццё культавай архітэктуры. Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, Пакроўскі сабор у Віцебске, царква Нараджэння Багародзіцы манастыра базыльянак у Гродна, касцёл Святой Ганны ў Мосары, касцёл Святой Тэрэзы ордэна піяраў у Шчучыне, касцёл Святога Іосіфа ў Валожыне, сабор Святога Міхаіла Архангела ў Лідзе.

Будаўніцтва грамадскіх будынкаў: гандлёвыя рады, школы, гімназіі, семінарыі, конна-паштовыя станцыі. Жыллёвае будаўніцтва.

### Тэма 6.2. Рэтраспектывізм у мастацкай культуры Беларусі

Прычыны і вынікі з'яўлення гістарызму ў архітэктуры. Эклектыка ў мастацтве Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзях. З'явы стылізацыі і кампілятыўнага перайманне ў мастацтве. Рэтраспектыўныя стылёвыя накірункі ў беларускай архітэктуры: рэтраспектыўна-гатычны і рэтраспектыўна-рускі накірункі; неаготыка, неарускі стыль, неабарока, неакласіцызм, неараманіка.

Рэтраспектывізм у палацава-замкавай архітэктуры: Пішчалаўскі замак у Мінску, палац Пуслоўскіх у Косаве, палац генерал-губернатара Гатоўскага ў г. Чырвоны Бераг, палац Чапскіх у Прылуках, сядзіба графа Э.Гутэн-Чапскага ў Станькава.

Культавая архітэктура рэтраспектывізму.

Станаўленне рэтраспектыўна-рускага стылю. Рэтраспектыўна-рускі стыль – нацыянальна-рамантычны мастацка-стылёвы накірунак, арыентаваны на

аднаўленне традыцый і форм старажытнарускага царкоўнага дойлідства. Накірункі рэтраспектыўна-рускага стылю: 1) Руска-візантыйскі – стварэнне архітэктурнага вобраза на аснове сімбіёзу форм сярэдневяковага рускага культавага дойлідства з элементамі візантыйскай архітэктуры. Запазычанні з архітэктурнага арсенала ўладзіміра-суздальскай і раннемаскоўскай архітэктурных школ, а таксама з элементамі формаўтварэння і дэкору сярэдневяковага візантыйскага дойлідства. Крыжаўзвіжанскі сабор Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку, Ільінская царква ў Бешанковічах, царква Святых Пятра і Паўла ў вёсцы Вензавец (Дзятлаўскі раён). 2) Маскоўска-яраслаўскі накірунак – выкарыстанне падоўжна-восевай чатырохчасткавай кампазіцыі – прытвор-званіца, трапезная, малітоўная зала, апсіда, выкарыстанне матываў цаглянай архітэктуры XVII стагоддзя, а таксама шатровых завяршэнняў аб’ёмаў. Уваскрасенскі сабор у Барысаве, капліца-усыпальніца Паскевічаў у Гомелі. 3) Сінадальны накірунак – кананізаваны накірунак рэтраспектыўна-рускага стылю. Крыжаўзвіжанская царква ў Высокім (Камянецкі раён), царква Раства Багародзіцы ў Гершонах (Брэсцкі раён), царква Святога Аляксандра Неўскага ў Крэва і інш.

Рэтраспектыўная готыка ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Пераацэнка гатычнай архітэктуры на Беларусі. Абумоўленасць вяртання да готыкі панаваннем у грамадстве сентыментальна-рамантычнага светапогляду. Арыентацыя на готыку як на магутнае ўвасабленне каталіцкай сакральнасці. Праабражэнскі касцёл у вёсцы Новая Мыш (Баранавіцкі раён), Крыжаўзвіжанскі касцёл і Троіцкі касцёл (Святога Роха, Залатагорскі) у Мінску, капліца-пахавальня Лапацінскіх ў Сар’і (Верхнядзвінскі раён), капліца-пахавальня ў Райцы (Карэліцкі раён), капліца-пахавальня Ажэшкаў у Заказелі (Драгічынскі раён).

Неарускі стыль у беларускай архітэктуры. Трансфармацыя старажытных архітэктурных форм, акцэнт на галоўных каштоўнасцях рускай нацыянальнай архітэктуры – эпічнасць, гераічная моц і размах, казачнасць і паэтычнасць. Аляксандра-Неўская царква на Вайсковых могілках у Мінску, капліца-пахавальня ў Міры (Карэліцкі раён).

Неараманіка ў архітэктуры Беларусі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Цяжкія, закрытыя, масіўныя формы, статычная прыземленасць кампазіцыі, суровы абарончы характар, лаканізм і суровасць “рыцарскага” выгляду, умоўнасцю і абагуленасць дэкору. Касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску – спалучэнне неараманікі і неаготыкі. Крыжаўзвіжанскі касцёл у Вілейцы, Троіцкі касцёл у Зэльве, касцёл Адшукання Святога Крыжа ў Астраўцы, касцёл Божага Цела ў Іказні (Браслаўскі раён), касцёл Святой Варвары ў Віцебску.

### Тэма 6.3 Выяўленчае мастацтва канца XVIII – XIX стагоддзяў

Іканапіс. Разны і ляпны арнамент як галоўны фон ікон. Росквіт іканапісных школ у другой палове XVIII ст.: брэсцкая, магілёўская, віцебская Асаблівасці ікон: умоўнасць і сімвалізм, выкарыстанне этнаграфічных элементаў, імкненне адлюстраваць навакольную рэчаіснасць, багатая і

разнастайная арнаментыка, выкарыстанне расліннага арнаментальнага фону. Разныя і ляпныя абклады ікон. Ікона “Варвара пакутніца” Яна Васілевіча.

Росквіт станковага жывапісу. Віленская мастацкая школа. *Францішак Смуглевіч* як майстар вялікіх шматфігурных кампазіцый на гістарычную, рэлігійную і бытавую тэматыку, пейзажыст (“Сяляне за сталом”, “Сцэна з сялянскага жыцця”, “Сяляне ў нацыянальных касцюмах”, “Прысяга Т.Касцюшкі на кракаўскім рынку”, “Апафеоз паўстання Т.Касцюшкі”, роспісы Віленскага кафедральнага сабора (фігуры 12 апосталаў)). Дынаміка кампазіцый, вялікая псіхалагічная выразнасць, багацце складаных і разнастайных ракурсаў. *Ян Рустэм* як стваральнік гістарычных і бытавых кампазіцый, пейзажаў, сатырычных малюнкаў, гравюр, майстар жанравага партрэта. Партрэты дзеячоў Беларусі (Ганны Ваньковіч, Томаша Зана, аўтапартрэт і інш.): дакладнасць малюнка, прывабны каларыт, выдатная светлаценевая мадэліроўка. Творчасць *Іосіфа Аляшкевіча*. Спалучэнне класіцызму і рамантызму ў партрэтах мастака (“Партрэт князя Адама Чартарыйскага”, “Партрэт Генрыха Ржэвуцкага”, “Партрэт графа Плятэра”, партрэты піяністкі Шыманоўскай, паручніка Рыклеўскага, А.Міцкевіча, членаў сям’і генерала Альхоўскага). *Юзэф Пешка* – польскі і беларускі партрэтыст і жывапісец гістарычнага жанру, яскравы прадстаўнік стылю класіцызм у выяўленчым мастацтве. Творы на гістарычную тэматыку і партрэты: “Пастрыжэнне Мячыслава І”, “Усталяванне пагранічных слупоў Мячыславам І”, “Групавы партрэт сям’і Станіслава Манюшкі”. Нясвіжскі перыяд творчасці: “Баляслаў Крывагубы, які нападае на паморат”, “Смерць Баляслава Крывагубага”, “Арыстыд піша сам сабе загад на выгнанне”, “Партрэт Тэафілы Радзівіл”, “Тры грацыі”. Творы Віленскага перыяду: “Перамога Сабескага пад Венай”, “Хрыстос перад Пілатам”, партрэт гетмана Касакоўскага. Увага да характару персанажаў, антуражу, рук, поз мадэляў. *Ян Дамель* – буйнейшы прадстаўнік беларускага гістарычнага жывапісу першай паловы XIX ст. Творчы шлях мастака ад класіцызму праз рамантызм да рэалізму. Карціны “Сустрэча Яна III з царом Леапольдам пад Венай”, “Гібель князя Панятоўскага”, “Гібель правадыра крыжакоў Ульрыха ў Грунвальдскай бітве” (не захаваліся), “Смерць Глінскага ў няволі”, “Вызваленне Касцюшкі з цямніцы”, “Твардоўскі паказвае Сігізмунду Аўгусту цень яго жонкі Барбары”, “Цар Аляксандр І падпісвае ў Вільні амністыю”, акварэль “Адступленне французаў праз Вільню”. Рэлігійны жанр у творчасці мастака: “Палажэнне ў труну”, “Хрыстос, які нясе крыж”, “Святая Дзева з дзіцём Ісусам”, “Зняцце з крыжа”, “Узнясенне ў неба”, “Хрыстос і самарыцянка”, “Ахвяра Аўраама”. Партрэты Яна Дамеля: партрэты Іахіма Храптовіча, хлопчыка, Дамініка Радзівіла, рэктара Віленскага універсітэта Шымана Малеўскага, губернатара Гіцэвіча, графа Канстанціна Тышкевіча і інш. *Валенцій Ваньковіч*: творчы шлях ад акадэмічнага класіцызму праз рамантызм і сентыменталізм да рэалістычнага адлюстравання жыцця (“Адам Міцкевіч на скале Аю-Даг”, “Напалеон ля вогнішча перад боем”, “Мадонна з дзіцём”, партрэты А.Пушкіна, Антона Гарэцкага, піяністкі Марыі Шыманоўскай, Андрэя Тавяньскага, Караліны

Тавяньскай.). Творчасць *Напалеона Орды.* Архітэктурна-ландшафтныя краявіды як увасабленне вобраза радзімы. Папкі, партфелі і альбомы. Папкі па Гродзенскай губерні (144 планшэты), Мінскай губерні (64 планшэты), Віленскай губерні (50 планшэтаў), Віцебскай губерні (35 планшэтаў), Магілёўскай губерні (15 планшэтаў), партфелі з малюнкамі па Валынскай, Кіеўскай, Падольскай, Ковенскай губернях, Княству Познаньскаму, Заходняй Прусіі і Галіцыі, Францыі, Германіі, Іспаніі, Партугаліі, "Альбом відаў гістарычных польскіх". Тэхніка малюнку Н.Орды – аловак, падмаляваны акварэллю, гуашшу або сепіяй (паўпразрыстая карычневая фарба). Сядзібы і памятныя мясціны славутых культурных дзеячоў (А.Міцкевіча ў в. Завоссе, М.Агінскага ў Літве, С.Манюшкі ў в. Убель, І.Ходзькі ў в. Дзевятня ў Літве, У.Сыракомлі ў Смольгаве і інш.), старажытныя замкі і помнікі абарончага дойлідства (Камянецкая вежа, Стары і Новы замкі ў Гродне, замкі ў Крэве, Лідзе, Навагрудку, Геранёнах і інш.), культавыя збудаванні (Барыса-Глебская царква ў Гродне, Сафійскі сабор і Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку, Нясвіжскі кляштар бенедыктынак, Дамініканскі касцёл у Дзярэчыне і інш.), вясковыя пабудовы на малюнках Н.Орды. *Канстанцін Кукевіч* – адзін з найбольш яскравых прадстаўнікоў бытавога жанра ў беларускім жывапісе першай паловы XIX ст. Адсутнасць ідэалізацыі персанажаў у творах "Салдат, які разводзіць вогнішча ў лесе", "Гусары", "Рускія салдаты ў вёсцы", "Прывал уланаў ля пераправы праз раку", "Карчма", "Салдацкі прывал", "Яўрэйскія кантрабандысты ў ваколіцах Вільна". Графічная спадчына мастака ("Гандляр шапкамі", "Букініст", "Карчма ў прадмесці"). *Фёдар Тулаў* як выдатны беларускі партрэтыст (партрэты М.Шалахоўскага, Л.Шалахоўскай, П.Мураўёва, мастака Трапініна і інш.).

Уплыў Пецярбургскай мастацкай школы на развіццё беларускага мастацтва. *Нікадзім Сілівановіч* – беларускі жывапісец XIX ст., выдатны каларыст і рысавальшчык, яскравы прадстаўнік бытавога жанру і партрэта, рэаліст. Адлюстраванне жыцця беларускага народа ў творах "У школу", "Дзеці ў двары". Партрэты Н.Сілівановіча ("Партрэт яўрэя", "Партрэт бацькі", "Галава дзяўчыны", "Стары пастух", "Аўтапартрэт", "Партрэт сына" і інш.). *Іван Хруцкі* – прадстаўнік беларускага партрэтнага жывапісу XIX ст., заснавальнік класічнага нацюрморта. Атрыманне залатога медаля за карціну "Старая, якая вяжа панчохі" (1838 г.), звання акадэміка за нацюрморт "Кветкі і плады" (1839 г.). Рысы сацыяльнай прыналежнасці ў адзенні, антуражы, выразу твару (партрэты жонкі Лепельскага павадыра дваранства Грабнецкага, старасты Неміровіча, пісьменніка П.Янкоўскага, мітрапаліта Іосіфа Сямашкі, гісіторыка Мікалая Маліноўскага і інш.). Засяроджанасць увагі мастака на выпісанасці прадметаў – кветак, садавіны, гародніны як характэрная рыса нацюрмортаў ("Кветкі і плады", "Грыбы і гародніна", "Плады і садавіна", "Кветкі і садавіна", "Плады і дыня", "Ружы і плады", "Нацюрморт са свечкай" (8 варыянтаў), "Мяса і гародніна", "Нацюрморт з рыбай", "Плады"). *Казімір Альхімовіч* – буйны прадстаўнік беларускага гістарычнага жывапісу XIX ст. ("Смерць у выгнанні",

“Пахаваннне на Урале”). Цікавасць да гісторыі сваёй радзімы, патрыятычныя матывы ў творах “Пахаванне Гедыміна”, “Пасля бітвы”, “Смерць Міхаіла Глінскага ў цямніцы”, “Падрыхтоўка да смерці Самуіла Збароўскага”, “Багіня кахання Мільда”, “Смерць Маргіера”, “Апошні жрэц Літвы з дачкою Плёнтай”, “Язычніцкія жрацы”. Жыццё і быт прыгонных сялян і дробнай шляхты ў карцінах “Жніво”, “Дажынкі”, “Наём працаўнікоў”, “Хата селяніна”, “Дзеці пад лесам”. *Вітольд Бялыніцкі-Біруля* як выдатны прадстаўнік жанру пейзаж. Атрыманне залатога медаля за карціну “Весныя снягі” (1901 г.), залатога медаля на Мюнхенскай выставе за карціну “У час цішыні” (1909 г.) і залатога медаля на выставе ў Барселоне за карціну “Перад вясной”. Пейзажы “Вясенні дзень”, “У канцы зімы”, “Змоўклыя палі”, “У час цішыні”, “Квітнеючы бэз”, “Ціхая светлая ноч”, цыкл “Пушкінскія мясціны”.

Скульптура. Дзве буйныя школы скульптуры: віленская і маскоўская. Адкрыццё класа скульптуры ў Віленскім універсітэце (1803 г.). *Кароль Ельскі* як скульптар-монументаліст (разам з арх. К.Спампані аздабленне палаца ў Заслаўі, царквы ў в. Чапцы Нясвіжскага р-на, Віленскага кафедральнага сабора і інш.). *Казімір Ельскі* – яскравы прадстаўнік класіцызму (барэльефы калоннай залы Віленскага універсітэта – барэльеф “Алегорыя скульптуры”). *Рафаэль Слізень* як майстар медальёнаў і барэльефаў культурных дзеячоў эпохі – Генрыха Ржавускага, Тамаша Зана і інш. *Ян Астроўскі* як майстар камернай скульптуры (медальёны ў гіпсе) і партрэтыст (бюсты Я.Тышкевіча, Т.Касцюшкі, У.Сыракомлі). Творчасць *Алены Скірмунт*: партрэты (Януша Радзівіла і інш.), жанравыя кампазіцыі (“Шляхціч у сядзібе”, “Муза Талія”), творы на рэлігійную тэматыку (“Распяцце”), медалі (медаль з выявай Іосіфа Цэзара).

**Тэма 6.4 Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва канца XVIII – XIX стагоддзяў**

Ювелірная справа і апрацоўка металаў. Гетманскія булавы, жэзлы, парадныя шаблі, залатыя і сярэбраныя рэчы, фігуры апосталаў у замкавых калекцыях. Булава і паясы з Віцебска і Брэста, булава з Каўнаса. Кераміка. Тыпы кафлі: тэракотавая, манахромная рэльефная і паліхромная рэльефная, распісная. Дзве школы паліванай кафлі XVIII ст.: Полацкая – з наяўнасцю ангоба (падкладка пад паліву ў выглядзе густога белага парашка) і Віцебская – без ангоба (з кладкай палівы на чарапок). Галандскія ўзоры як аснова распіснай кафлі. Вырабы фаянсавых мануфактур у Свержані і Целяханах: вазы для духмянасцяў (pôt pourri), кафля, падсвечнікі, фігуркі і садовыя вазы з яркімі пластычнымі рэльефамі, кветкамі, гірляндамі, бычынымі галовамі, жаночымі маскамі. Мастацкае шкло. Выраб люстэрак на мануфактурах ва Урэччы і Налібаках. Ткацтва. Шаўковая і залотная тканіна. Тэхніка “points rentrés”. Ткацкія мануфактуры ў Ружанах і Гродне. Вышыўка біццю і каніцеллю. Вышыўка гладдзю.

## Раздзел 7. Мастацтва Беларусі XX ст.

### Тэма 7.1 Архітэктура Беларусі XX ст.

Стыль мадэрн, яго нацыянальныя асаблівасці: акцэнтаванне вуглоў перакрыжавання вуліц вежавымі формамі, імкненне да скразной забудовы вуліц, гістарычныя формы і матывы ў дэкаратыўным аздабленні будынкаў. Устанаўленне выразнай сувязі паміж формай і функцыяй у творчасці арх. О.Краснапольскага. Два шляхі канструктыўнасці мадэрну: праз засваенне архітэктурнай спадчыны готыкі (сядзіба ў вёсцы Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна, арх. К.Шрэтэр) і ранняга рускага сярэднявечча (пазямельна-сялянскі банк у Віцебску, інж. К.Тарасаў). Ранні мадэрн, яго асаблівасці: адмаўленне ад механічнага капіравання гістарычных форм, сінтэз архітэктуры з пластыкай (капліцы-пахавальні Паскевічаў у Гомелі, Святаполк-Мірскіх у Міры). Творчыя тандэмы архітэктараў і скульптараў: С.Шабунеўскага і П.Яцыны, Г.Гая і Я.Тышынскага. Сувязь дэкора з канструкцыяй: дзвярныя і аконныя абрамленні, металічныя рашоткі балконаў, лесвічных клетак, казыркоў (жылы дом Чалакаева ў Гродне, даходны дом у Магілёве, камерцыйны банк у Слоніме). Сталы мадэрн: рэгіянальныя праявы (выкарыстанне каменя-валуна, спалучэнне каменнай і цаглянай муроўкі, гладкай і фактурнай тынкоўкі).

Узрастанне ролі грамадскіх будынкаў у сістэме горадабудаўнічых вырашэнняў. Будаўніцтва стадыёнаў, тэатраў, клубаў, грамадскіх палацаў, гасцініц. Аднатыповасць вырашэнняў будынкаў банкаўскіх кантор: рустоўка першых паверхаў, размяшчэнне вокнаў у плоскіх нішах і наданне ім паўцыркульнай ці цыбулепадобнай форм, выкарыстанне вежавых форм, аздабленне сандрыкамі.

Стварэнне праектнага інстытута “Белдзяржпраект” (1933 г., дырэктар – А.П.Воінаў). Распрацоўка генпланаў Магілёва (арх. М.Андросаў, Н.Трахтэнберг), Оршы і Мазыра (арх. П.Кірыенка), Полацка (арх. І.Рапапорт), Слуцка і Рэчыцы (арх. Г.Парсаданаў).

Канструктывізм і неакласіцызм у архітэкутры Беларусі. Творчасць І.Лангбарда і Г.Лаўрова. Нацыянальная бібліятэка, гарадок 1-й клінічнай бальніцы, галоўны корпус БНТУ (да перабудовы), Дом друку, Дом Урада, будынак Прэзідыума НАН Беларусі, тэатр оперы і балета ў Мінску.

Змены горадабудаўнічай стратэгіі ў 1940-х гг. Генплан развіцця Мінска (1944–1946 гг., арх. М.Андросаў, Н.Трахтэнберг па эскізе і пры кансультаванні арх. А.Шчусева, У.Сямёнава, А.Мардвінава, М.Палякова, М.Колі, Б.Рубаненкі, І.Лангбарда, Н.Трахтэнберга): ідэя ўвасаблення сродкамі пафасу вялікай Перамогі, узвелічэнне здзейсненага народам подзвігу. Забудова галоўнай восі Мінска – вул. Савецкай (сучасны праспект Незалежнасці). Кіраванне будаўнічымі работамі Мінска прафесарам Масквы У.Сямёнавым. Творчасць архітэктараў М.Парусніказа, І.Лангбарда, М.Колі, У.Караля, А.Воінава, М.Баршча, Г.Заборскага. Перавага “выяўленчасці” ў архітэктуры. Развіццё ідэі “аплікатыўнай” архітэктуры: “прыстаўкі” класічных порцікаў да будынкаў, ужыванне арнаменту, запазычанага з народнага дэкаратыўнага мастацтва:

будынкі галоўнага паштампа (арх. А.Духан, У.Кароль), дзяржаўнага банка (арх. М.Паруснікаў) у Мінску, ансамбль забудовы вул. Кірава ў Віцебску (арх. В.Гусеў, В. і А.Данілавы), драматычны тэатр у Гомелі (арх. А.Тарасенка). Ідэя стварэння радыяльна-кальцавой сістэмы планіроўкі Мінска.

Генплан развіцця Мінска 1965 г. (арх. Л.Гафо, Я.Заслаўскі, А.Наканечны, І.Люблінскі, Н.Кудзінаў, Н.Трахтэнберг): ідэя стварэння рукатворнага ландшафту. Канцэпцыя генеральнага плана развіцця Мінска 1982 г. (да 2000 г., кір. Ю.Пурэцкі). Забудова новых раёнаў з максімальным выкарыстаннем рэльефа і акаляючых лясных масіваў. Будаўніцтва мікрараёнаў. Функцыянальны падыход у грамадзянскай архітэктуры. Тыпавое праектаванне. Узбуйненне маштаба забудовы вялікіх гарадоў. Постмадэрнізм у архітэктуры Беларусі.

**Тэма 7.2 Манументальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі XX ст.**

Мазаіка і вітраж пачатку XX ст. Мастацтва 1920–1930-х гг. Адкрыццё скульптурнага аддзялення ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1924 г.). Скульптурныя помнікі дзеячам міжнароднага рэвалюцыйнага руху (скульпт. А.Бразер, К.Елісееў, В.Мацвееў, М.Цэханоўскі, Д.Якерсон). Афармленне Дома ўрада (скульпт. М.Керзін, З.Азгур, А.Бембель, А.Глебаў, А.Арлоў, А.Жораў, Г.Ізмайлаў). Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва: афармленне нацыянальных твораў (маст. К.Елісееў, А.Марыкс). Мастацтва 1940–1950-х гг. Вобразы воінаў-вызваліцелей у скульптурных партрэтах А.Бембеля, З.Азгура, А.Грубэ, А.Глебава, С.Селіханава, братоў Л. і М.Робернанаў: імкненне да тыпізацыі вобразаў. Манументальная скульптура як вядучы від мастацтва: помнік Сталіну на Цэнтральнай плошчы ў Мінску, гарэльефы для манумента Перамогі ў Мінску (скульпт. З.Азгур, А.Бембель, А.Глебаў, С.Селіханаў, арх. Г.Заборскі і У.Кароль). Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва: жывапісна-аб'ёмная сістэма дэкарацый, імкненне да рэалістычнай перадачы быту і прыроды ў афармленні пастановак на тэму вайны (працы П.Масленікава, І.Ушакова, С.Нікалаева). Манументальная скульптура 1960–1980-х гг.: стварэнне комплексаў са шматпланавай прасторавай кампазіцыяй. Комплексы "Хатынь" (скульпт. С.Селіханаў, арх. Л.Левін, Ю.Градаў), "Курган Славы" (скульпт. А.Бембель, А.Арцімовіч, арх. А.Стаховіч, Л.Міцкевіч), "Брэсцкая крэпасць-герой" (скульпт. А.Бембель, А.Кібальнікаў, У.Бабыль, арх. У.Кароль, В.Волчак, В.Занковіч, Ю.Казакоў, А.Стаховіч, Г.Сысоеў), Курган Славы Савецкай Арміі (скульпт. А.Бембель, А.Арцімовіч, арх. Л.Міцкевіч, А.Стаховіч). Манументальна-дэкаратыўная скульптура, звязаная з фарміраваннем гарадскога асяроддзя: фантаны "Юнацтва" А.Анікейчыка, "Вясна. Зоў вясны" А.Шатэрніка, "Купалле" А.Анікейчыка, Л.Гумілеўскага, А.Заспіцкага, "Зіма. Каляды" В.Занковіча. Псіхалагічныя, маральныя і гуманістычныя аспекты манументальнай пластыкі ў творах А.Анікейчыка (помнік Я.Купале ў Мінску), А.Глебава (помнік Ф.Скарыне ў Полацку), А.Заспіцкага, М.Рыжанкова, І.Міско (помнік М.Горкаму ў Мінску), С.Гарбуновай (помнік С.Буднаму ў Нясвіжы).

Манументальны жывапіс: творчасць мастака А.Кішчанкі. Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва: выкарыстанне новых відаў прасторавых канструкцый, мастацкай метафары, колеравага асвятлення ў творчасці М.Апіёка, М.Волахава, В.Галубовіча, Гейдэбрэхта, А.Грыгар'янца, Я.Ждана, Я.Лысіка, З.Марголіна, У.Матросава, А.Салаўёва, Ю.Тура, В.Цімафеева, Я.Чамадурава, У.Чарнышова, М.Якуніна і інш.

Аздабленне інтэр'ераў гасцініц, рэстаранаў, палацаў культуры: габелен "Музыка" у інтэр'еры Мінскага мастацкага вучылішча (1975 г., А.Кішчанка), серыя габеленаў для фае Дзяржаўнага тэатра оперы і балета (1985 г., А.Кішчанка), кованае аздабленне ў інтэр'ерах рэстарана "Журавінка" (1969 г., Ю.Любімаў), гасцініцы "Турыст" (1973 г., Ю.Любімаў), керамічныя творы ў інтэр'ерах кафэ "Бульбяная" ў Мінску (1983 г., М.Несцярэўскі), рэстарана "Заслаўе" (1989 г., В.Прыешкін), афармленне інтэр'ера Палаца Рэспублікі (габелены Н.Пілюзінай, В.Грыдзіна, В.Крывашэева).

**Тэма 7.3 Станковы жывапіс і графіка Беларусі XX ст.**

Дзейнасць народнай мастацкай школы ў Віцебску, мастацкіх студый у Віцебску, Магілёве, Гомелі, Оршы, Мінску. Стварэнне Усебеларускай асацыяцыі мастакоў (1927 г.) і яе рэарганізацыя ў Рэвалюцыйную арганізацыю мастакоў Беларусі (1928 г.). Мастацкае аб'яднанне "Прамень". Творчасць *Фердынанда Рушчыца* – паслядоўніка стылю рамантызм і заснавальніка плыні "каларызму" ў беларускім жывапісе. Краявіды Ф.Рушчыца ("Зімовая казка", "Старыя яблыні", "Зіма", "Вясна"). Казачнасць ("Балада") і драматызм ("Зямля", "Эмігранты") у жывапісе мастака. Ф.Рушчыц як графік ("Пагоня", этнаграфічныя паштоўкі, афармленне часопіса "Атэнэум"). Традыцыі Віленскай мастацкай школы ў творчасці *Язэпа Драздовіча*. Жывапіс, кніжная графіка, часопісная графіка і дробная пластыка Я.Драздовіча. Я.Драздовіч як заснавальнік жанру фантастычнага жывапісу ("Сустрэча вясны на Сатурне", "Жыццё на Марсе", "Жыццё на Луне", "Нірвана"). Гістарычная тэматыка ў творах Я.Драздовіча ("Усяслаў Чарадзей", "Францыск Скарына", "Францыск Скарына ў сваёй друкарні"). Маляваныя дываны Я.Драздовіча ("Месячны краявід з замкам"). Нацыянальны каларыт твораў *Міхася Філіповіча*. Пошукі вырашэння колеравай праблемы ў жывапісе мастака ("Беларуская сялянка", "Сялянская дзяўчына", "На Купалле"). Дробная пластыка М.Філіповіча ("Дудар", "Лявоніха", "Жалейка"). Рэалістычнае адлюстраванне мадэляў у партрэтах *Якава Кругера* ("Дзяўчына ў чырвоным", "Аўтапартрэт", "Перапісчык Торы"). Віцебская мастацкая школа. Авангардны жывапіс *Марка Шагала* ("Віяланчэліст", "Прагулка", "Мастак і муза", "Яўрэй з Торай і Анёлам", "Заснуўшае мястэчка", "Жаніх і нявеста Эйфелевай вежы"). Нацыянальныя карані ў кніжных ілюстрацыях і афотах М.Шагала. Рэалістычны жанравы і партрэтны жывапіс *Юдэля Пэна* ("Развод", "Майстар гадзіннікаў"). Пейзажны жывапіс *Уладзіміра Кудрэвіча*: імпрэсіяністычная ("Раніца вясны") і акадэмічная ("Паром на Дзвіне", "Набліжэнне навальніцы", "Зіма на Мінскім возеры") манера пісьма. Дзейнасць арганізацыі "УНОВИС" (В.Ермалаевай,

М.Когана, Л.Лісіцкага, К.Малевіча, М.Суэціна, І.Чашніка і інш.). Агітацыйная графіка і плакат: метафарычныя элементы, графічны лаканізм. Творы А.Быхоўскага, С.Кракоўскага, П.Гуткоўскага, В.Дваракоўскага, Л.Лісіцкага, М.Станюты, Б.Ульпі, Я.Целішэўскага, С.Юдовіна. Станковая, часопісна-газетная, прыкладная графіка і тэатральны плакат І.Валадзько, П.Гуткоўскага, П.Мрачкоўскай, І.Пляшчынскага. Кніжная графіка (П.Гуткоўска, В.Дваракоўскі, Г.Змудзінскі, В.Літко, А.Тычына, М.Эндэ). Афармленне часопісаў “Маладняк”, “Світанак”, “Наддзвінне”. Маляваныя дываны А.Кіш.

Ваенная тэматыка ў творах мастакоў. Рэалістычны жывапіс І.Ахрэмчыка (“Абаронцы Брэсцкай крэпасці”), В.Волкава (“Мінск. 3 ліпеня 1944 года”), А.Гугеля (“З мінулага”), Я.Зайцава (“Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе”), Х.Ліўшыца (“Зверствы немцаў у Беларусі”), У.Сухаверхава (“За родную Беларусь”), Я.Ціхановіча (“Партызаны ў разведцы”), А.Шыбнёва (“Палонных вядуць”). Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў графічных творах А.Волкава, С.Геруса, П.Дурчына, Л.Лейтмана, С.Раманава. Вобразная выразнасць, псіхалагізм, глыбіня прасторы ў графіцы Б.Заборава, А.Зайцава, А.Кашкурэвіча, Г.Паплаўскага, Н.Паплаўскай. Развіццё станковай гравюры. Этнаграфічна-фальклорная тэндэнцыя ў графічных творах А.Лось, Н.Паплаўскай, А.Паслядовіч. Жывапіс *Віталя Цвіркі*. Цыкл Узбекскіх пейзажаў (“Узбекскі матыў”, “Раніца. Кішлак”). Тэма вызвалення ад акупацыі ў творчасці В.Цвіркі (“Непакорныя”). Пейзажны жывапіс мастака (“Цёплы вечар”, “Зіма”, “Вясна”, “Беларускі пейзаж”, “Мая радзіма”, “На прасторах Беларусі”, “На зямлі Беларускай”, “Лазурны дзень”). Нацыянальны каларыт пейзажнага жывапісу і нацюрмортаў *Валяр’яны Жолтак* (“Зіма прыйшла”, “Вясенні пейзаж. Разліў”, “Дарогі”, “Званочкі лясныя”, серыя нацюрмортаў “Поры года”). “Суровы стыль” у беларускім мастацтве: зварот да паўсядзённасці, адмаўленне ад пышнасці і ўрачыстасці. Вялікая Айчынная вайна, калектывізацыя, сучаснасць – галоўныя тэмы ў творчасці *Аляксандра Мазалёва* (“У партызанскім штабе Бацькі Міная”, “На канікулах”, “Мінск. Плошча Перамогі”). Маральны кантэкст і драматургічная будова твораў *Мая Данцыга* (“Гудзіць зямля Салігорская”, “Навасёлы”). Адлюстраванне жыцця роднага горада ў творах М.Данцыга (“Раніца новага Мінска”, “Мінск. Руіны Нямігі”, “Мой Мінск”, “Мой горад старажытны, малады”). Адлюстраванне гераічнай і трагічнай тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах *Міхаіла Савіцкага* (“Партызаны”, “Партызанская мадонна”, “Віцебскія вароты”, “Пакаранне смерцю”). Кампазіцыйна-пластычная будова і этнаграфічныя рысы ў творах “Ільнаводы”, “Сцелюць лён”, “Хлеб”. Нацыянальны каларыт і сімвалізм у творчасці *Уладзіміра Стальмашонка* (партрэты Я.Коласа, Р.Шырмы, “Успаміны”). Рысы “суровага” жывапісу ў творах П.Крахалёва (“Будаўніцтва гідраэлектрастанцыі “Дружба народаў”, “Мінулыя паходы”), І.Рэя (“Партызанскі сувязны”, “Партрэт калгасніка калгаса “Бальшавік”), Я.Красоўскага (“Мінскі трактарны завод. Выплаўка сталі”). Авангардны жывапіс: праблема каларыстычных адносінаў і канструктыўная мастацкая

структура твораў Р.Кудрэвіч (“Персікі”, “Нацюрморт з воблай”, “Нацюрморт з чорнай смародзінай”), І.Басава (“Дом з чырвоным дахам”, “Мелодыя”, “Зноў лета”, “Бег”), А.Малішэўскага (“Маці”, партрэт А.Кашкурэвіча).

Цікавасць да нацыянальнай гісторыі і культуры ў жывапісе. Своеасаблівасць творчай манеры мастака *Гаўрыіла Вашчанкі*: спрашчэнне кампазіцыі, сімвалізм, лірызм (“Дума пра хлеб”, “Няміга”, “Маё Палессе”, “Палеская песня”). Партрэты Г.Вашчанкі: “Косцік”, “Дзядзька Алесь”, “Маці”. “Балада пра мужнасць” – вяршыня творчасці Г.Вашчанкі. Экспрэсіўная выразнасць твораў *Васіля Сумарава* (“Платагоны”, “Хімзавод”). Паліфанічны характар палатна “Мой дом”. Эпічны пейзаж у творчасці В.Сумарава (“Зямля маёй маці”). Сістэма “прастора – плоскасць – аб’ём” у творах *Аляксандра Кішчанкі* (“Цыркавы хлопчык”, “Жэня”, “Дзяўчына з гарбузом”). Ваенная тэматыка ў творчасці *Леаніда Шчамялёва* (“Цяжкія гады”, “Маё нараджэнне”, “За свабодную Беларусь”, “Першы дзень міра”). Свет радаснага ўспрымання жыцця, свет прадметаўі фарбаў у творах *Нінэль Шчаснай* (“Бухара”, “Радуга”, “Снег ідзе”, “Бабачка”). Выразнасць і вытанчанасць колеру, выкарыстанне яго сэнсавых і сімвалічных якасцей у жывапісных творах М.Бушчыка, А.Кузняцова, Л.Хобатава. Імкненне да абвостранай экспрэсіі, эмацыянальна-выразнай выяўленчай формы ў графіцы А.Кашкурэвіча. Вытанчанасць графічнай мовы, удасканаленне мастацка-пластычнай формы, новыя кампазіцыйныя пошукі ў графічных творах Л.Рана, У.Савіча, А.Селешчука, Г.Скрыпнічэнкі, В.Славука, У.Вішнеўскага. Выкарыстанне змешанай тэхнікі, мантажу, аплікацыі ў кніжнай графіцы 1970 – пачатку 1990-х гг. Два кірункі ў ілюстраванні кніжных выданняў: асацыятыўны падыход (М.Селяшчук), пераказ сюжэта тэксту (В.Славук, В.Шаранговіч).

**Тэма 7.4 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XX ст.**

Кераміка 1920–1930-х гг. XX ст. Стварэнне Саюза Саматужніцка-прамысловай кааперацыі (1926 г.). Народныя рамёствы. Вазы, насценныя талеркі, букетнікі. Вытворчасць ганчарных арцеляў у Барысаве, Гарадку, Урэччы, Юравічах, Лядах. Традыцыйны посуд, дэкаратыўныя талеркі з партрэтамі і жывапіснымі кампазіцыямі, вазы са скульптурнымі выявамі жывёл. Шкляныя вырабы даваенных часоў.

Рэарганізацыя фабрыкі Упраўлення мастацкай прамысловасці Беларусі (1960 г.). Адраджэнне мастацкіх рамёстваў у 1950–1960-х гг.: саломапляценне, лозапляценне, ткацтва, вышаўка. Івянецкая кераміка, жлобінская інкрустацыя, неглюбскае ткацтва. Вытворчасць цэхаў Мастацкага фонду Беларусі, мастацка-вытворчага камбіната і хрусталёвага завода ў Барысаве, шклазавода “Нёман”, Аршанскага льнакамбіната. Брэсцкія дываны. Прыярытэт мастацкай формы над арнаментыкай у керамічных і шкляных вырабах. “Дыяганальны” стыль. Асноўныя кірункі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва 1970 – 1990-х гг.: мастацкае шкло (маст. П.Анішчык, Г.Ісаевіч, Т.Малышава, Л.Мягкова), фарфор (маст. В.Данчук, В.Леантовіч), кераміка (маст. А.Зіменка, Т.Сакалова, Л.Панамарэнка), ткацтва (маст. В.Дзёмкіна, Н.Пілюзіна, Н.Сухаверава).

## Раздзел 8. Сучаснае мастацтва Беларусі

### Тэма 8.1 Сучасная архітэктура Беларусі

Новыя тэндэнцыі ў сучаснай архітэктуры. Мастацка-стылявыя змены ў архітэктуры постіндустрыяльнай эпохі. Фактары і сродкі мастацкай выразнасці ў сучаснай архітэктуры Беларусі.

Горадабудаўніцтва. Змены канцэпцыі развіцця гарадоў, пашырэнне іх межаў, узбуйненне планіровачнай структуры. Сістэма забудовы. Развіццё грамадскіх цэнтраў: шматвузлавая поліцэнтрычная лінейна-восевая кампазіцыя з зорчатай і веернай структурай. Фарміраванне і развіццё пешаходных зон.

Канцэптуальны падыход генеральнага плана развіцця Мінска 2003 г. (кір. А.Калантай, арх. Л.Ларына, Л.Зайцава, Я.Есьман, М.Друшчыц, З.Забароўская): комплекснае развіццё цэнтральнага ядра горада, грамадскіх і дзелавых цэнтраў рэспубліканскага і гарадскога значэння; выкарыстанне і развіццё ландшафтна-рэкрэацыйных тэрыторый; развіццё сістэмы гарадскога абслугоўвання, якое арыентавана на будаўніцтва гандлёвых, спартыўных, бытавых, камунальных аб’ектаў; жыллёвае будаўніцтва вышынных, шмат- і малапавярховых дамоў, катэджаў; рэканструкцыя прамысловых тэрыторый; развіццё ідэй “падземнага горада”, “City”. Праектаванне небаскробаў (праект “Golden City” па праспекце Незалежнасці, кіраўнік праекта – арх. В.Крамарэнка; праект “Minsk-City” на тэрыторыі аэрапорта Мінск-1, кіраўнік праекта – арх. Я.Ліневіч). Канцэпцыі генеральных планаў развіцця буйных і вялікіх гарадоў Беларусі. Удасканаленне гістарычна сфарміраванай сістэмы планіроўкі з вылучэннем сакральнай прасторы, прасторы гістарычнага цэнтра, агульнагарадскога цэнтра, раёнаў новай забудовы, жылых раёнаў і мікрараёнаў (мікрараёны № 11 і 12 у Гомелі, Юбілейны ў Магілёве, Поўдзень-5, 6 і 7 у Віцебску, Румлёва ў Гродне, жылыя раёны Асаўцы ў Гомелі, па праспекце Дзімітрава ў Магілёве, Пескавацік у Віцебску, Паўднёва-заходні ў Брэсце). Водна-зялёная прастора як аснова фарміравання кампазіцыі сучаснага вялікага горада. Эстэтычнае аблічча дарог Беларусі і архітэктура малых форм. Ландшафтны дызайн. Мастацкі вобраз малых гарадоў Беларусі. Пасёлкі і аграгарадкі.

Стылявыя змены ў архітэктуры. Сімбіёз неарацыяналістычнага, рэтраспектыўнага і авангарднага (наватарскага) пачаткаў. Асаблівасці архітэктуры неарацыяналізму: прынцыпы тэктонікі і манументальнасці; строгія формы аб’ёмаў-прызм; рытмічная ўпарадкаванасць элементаў і дэталей, якія падкрэсліваюць лагічную выразнасць канструкцыйнага вырашэння; прапарцыянальнасць; прастата знешняга аблічча, вызначаная стрыманасцю дэкаратыўнага аздаблення (Дом культуры ў Віцебску, будынкі тэатра драмы і камедыі ў Бабруйску, абласнога драматычнага тэатра ў Гродне, Палац Рэспублікі ў Мінску). Асноўны прынцып “рэтраспектыўнай” архітэктуры – зварот да гістарычнай спадчыны з мэтай запазычання ўзораў форм і элементаў, уласцівых стылям мінулых эпох (збудаванне Дзіцячага парку па вул. З.Касмадзям’янскай у Пінску, будынкі “Пріорбанка” ў Гродне, Пінскага

філіяла “Брэсткамбанка” па вул. Дняпроўскай флатыліі, Замежны гандлёвы дом “Кантыненталь” у Брэсце). Наватарскі пачатак як спалучэнне трох стылявых кірункаў: дэканструктывізму, неамадэрнізму, хай-тэку. Характэрныя рысы дэканструктывізму: імклівыя лініі, нахілы і зрухі плоскасцей, кансаліраванне верхніх паверхаў, гульня фактур матэрыялаў, колераў (будынкі “Белбізнесбанка” па вул. Савецкай у Брэсце, “Мінсккомплексбанка” па вул. Мяснікова, офісныя будынкі кампаніі “Лукойл” па вул. Няміга, па вул. Кульман, будынак медыцынскага цэнтра “Нардзін” у Мінску). Канцэпцыя вобраза-сімвала ў архітэктуры неамадэрнізму (Палац спорту ў Віцебску, комплекс Лядовага палаца, цэнтр моладзі “Айсберг”, будынак Нацыянальнай бібліятэкі па праспекце Незалежнасці, праект комплексу адміністрацыйнага будынка, офіснага цэнтра і гасцініцы “Golden City” ў Мінску). Характэрныя асаблівасці хай-тэку: наўмыснае агаленне металаканструкцыі, актыўнае выкарыстанне шкляных панэлей, “лёгкасць”, “паветранасць”, “светлапразрыстасць” (будынкі Футбольнага манежа, чыгуначнага вакзала, гандлёвага цэнтра “Еўропа”, комплексу “Аляксандраў пасаж” у Мінску, Летняга амфітэатру ў Віцебску).

Культавая архітэктура: праваслаўныя і каталіцкія храмы. Традыцыі гістарычных школ у архітэктуры праваслаўных храмаў: Уладзіміра-Суздальскай, Чарнігаўскай, Наўгародскай, Пскоўскай, Яраслаўскай, Растоўскай, Маскоўскай школ дойлідства XII–XVII стст., рысы драўлянага культавага дойлідства Беларусі. Гатычныя рысы ў архітэктуры каталіцкіх храмаў.

Індывідуальная, мала- і шматпавярховая архітэктура жылых будынкаў. Масавае і унікальнае ў жыллёвай архітэктуры.

Дэкаратыўныя сродкі выразнасці ў архітэктуры пачатку XXI ст.: жывапісныя – мазаіка; графічныя – графічныя надпісы, суперграфіка, заснаваная на каларыстыцы; пластычныя – рэльеф, круглая скульптура, фактура матэрыялаў аздаблення фасадаў. Сістэма дэкаратыўнага асвятлення гарадоў.

### Тэма 8.2 Выяўленчае мастацтва Беларусі на мяжы тысячагоддзяў

Гісторыка-культурная тэматыка ў манументальнай скульптуры: помнікі князю Давіду Мудраму, заснавальніку Давыд-Гарадка (2000 г., скульпт. А.Дранец, арх. Л.Левін), князю Барысу ў Барысаве (2002 г., скульпт. А.Арцімовіч, арх. І.Марозаў, Я.Кавалеўскі), Пятру Мсціслаўцу ў Мсціславе (2001 г., скульпт. А.Батвінёнак, А.Чыгрын, арх. Ю.Казакоў), святой Сафіі княжны Слуцкай у Слуцку (2000 г., скульпт. М.Іелькоў, арх. М.Лук’янчык), Ефрасінні Полацкай у Полацку (2002 г., скульпт. І.Голубеў, арх. В.Ягадніцкі), помнік-бюст Адама Міцкевіча ў Гродне (1998 г., скульпт. А.Заспіцкі, арх. Ю.Казакоў). Помнікі культурным дзеячам Беларусі: Ф.Скарыне (скульпт. С.Адашкевіч), М.Гусоўскаму (скульпт. В.Панцялееў), С.Буднаму і В.Цяпінскаму (2000 г., скульпт. І.Голубеў), К.Тураўскаму (2001 г., скульпт. А.Прохараў) ва ўнутраным дворыку БДУ, бронзавы помнік Ф.Скарыне каля

будынка Нацыянальнай бібліятэкі (скульпт. А.Дранец, арх. А.Камлюк) у Мінску. Мемарыяльная пластыка: помнікі ахвярам Халакоста на месцы былога яўрэйскага гета – “Яма” (скульпт. А.Фінскі, А.Полак, арх. Л.Левін), ахвярам трагедыі на Нямізе 30 мая 1999 г. (скульпт. Г.Буралкін, арх. А.Чадовіч). Паркавая і гарадская скульптура: у Міхайлаўскім скверы (“Дама на лаўцы”, “Прыкурваючы цыгарэту”, “Дзяўчына з парасонам”), каля Камароўскага рынку, “Дойлід”, “Паштальён”, “Лазеншчык” у Мінску, “Астролаг” па вул. Лепяшынскага ў Магілёве (усе – скульпт. У.Жбанаў).

Жывапіс другой паловы 1990 – 2000-х гг. Творчыя эксперыменты ў жывапісе: захапленне дэкаратыўнымі эфектамі і ідэалістычнымі матывамі (В.Альшэўскі, М.Басаў, У.Ганчарук, У.Зінкевіч, У.Кожух, Ю.Піскун, У.Тоўсцік).

Пашырэнне жанравага і тэхнічнага спектраў беларускай станковай і кніжнай графікі (Ю.Якавенка). Сінкрэтызм выяўленчых прыёмаў, узаемаўплыву відаў мастацтва і графічнага дызайну, фотаграфікі. Ужыванне змешаных тэхнік, калажу, магчымасцей камп’ютэрнай графікі. Афармленне кніжных выданняў (Ю.Алісевіч, І.Гардзіёнак, П.Татарнікаў). Плакат: выразнасць графікі, колеру і шрыфту (творы С.Войчанкі, А.Кітаевай, У.Цэслера, А.Шалюты і інш.). Мастацтва фатаграфіі: шматграннасць жанравых форм, творчых метадаў, канцэптуальных падыходаў, тэхнічнай разнастайнасці (творы А.Адамчык, М.Баразны, В.Бараноўскага, В.Ганчарэнкі, М.Жылінскага, Я.Казюлі, В.Лабко, Г.Маскалёвай, М.Раманюка і інш.).

**Тэма 8.3 Сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі**

Сінтэз дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з мастацтвам дызайну, скульптурай. Новыя пошукі пластычнага вобраза ў творчасці керамістаў В.Кавальчука (“Парыў ветру”, 1997 г.), З.Раўко (“Зебры”, 1993 г.), Т.Сакаловай (серыя “Трохмерныя аб’екты”, 2001 г.), шклаапрацоўшчыка У.Мухаверава (“Пакутнікі”, 1989 г.; “Незнаёмая”, 1999 г.). Вытворчасць аднакаляровага, празрыстага, матавага і люстэркавага шкла. Манументальнасць як прынцып дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Габелен А.Кішчанкі “Габелен стагоддзя” (1995 г.) – самы вялікі габелен свету. Асаблівасці габелену: шырыня тэматыкі, эмацыянальнасць, вобразная выразнасць, эксперыментальныя пошукі ў галіне тэхналогіі, фактуры, структуры тканіны. Творы Г.Гаркунова (“Дрэва”, 1994 г.), А.Салохінай (“Нясвіжскі парк”, 1999 г.; “Восеньскі нацюрморт”, 2000 г.), Л.Густавай (“Снегіры”, 1995 г.).

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
“Мастацкая культура Беларусі” для дзённай формы атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, занятка; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Пазааўдыторная самастойная работа | Метадычнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Кіруемая (кантралюемая) самастойная работа студэнтаў | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **1 курс, 2 семестр** | | | | | | | | |
| **1** | **Тэарэтычныя аспекты мастацкай культуры Беларусі** | **4** | | **2** | | | **4** | | |
| 1.1 | **Мастацтвазнаўства як навука**. Беларускае мастацтвазнаўства – адносна маладая галіна навукі. Першыя спробы мастацтвазнаўчага аналізу творчасці мастакоў XIX ст. Мастацтвазнаўства Беларусі ў паслярэвалюцыйны час: даследванні М.Шчакаціхіна. Развіццё мастацтвазнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны. Стварэнне ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. | 2 | | | | | 2 | | |
| 1.2 | **Сучаснае мастацтвазнаўства Беларусі.** Росквіт айчыннага мастацтвазнаўства ў 1990 – 2000-я гг. Грунтоўныя выданні па гісторыі мастацтва як тэарэтычная база вывучэння мастацкай культуры Беларусі. | 2 | | | | | | | |
| | Навуковыя публікацыі даследчыкаў гісторыі беларускага мастацтва па пытаннях горадабудаўніцтва і архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. | | | 2 | | | 2 | | Даклады |
| **2** | **Мастацтва Беларусі ў старажытны перыяд** | **6** | | **4** | | **2 л** | **10** | | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.1 | **Архітэктура Беларусі ў старажытны перыяд**<br>Старажытныя паселішчы і гарадзішчы. Першыя архітэктурныя формы: іх характар, функцыі, знешняе аблічча. Рэшткі паслелішчаў позняга палеаліту: жыллё з выкарыстаннем касцей маманта каля вёсак Бердыж Чачэрскага раёна і Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. Неалітычнае жыллё-паўзямлянка круглай у плане формы. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [6], [8], [25] | |
| | Першая прамысловая архітэктура – крэмневыя шахты. Спецыфіка такого мінеральнага ўтварэння як крэмень у якасці экспартнага прадукту. Геаграфія размяшчэння старажытных крэмневых шахт. Шахты і звязаныя з імі майстэрні па апрацоўцы здабытага каменя. Апрацоўка крамянёвай сыравіны ў старажытных шахтах і майстэрнях. | | | | | 2 л | | Літаратура асн. [3], дад. [6], [8], [25] | |
| | Двухкамернае жыллё бронзавана веку прамавугольнай у плане формы з двухсхільным дахам. Гарадзішчы жалезнага веку. Формы гарадзішчаў жалезнага веку: трохвугольная, авальная, круглая, чатырохвугольная. Канструкцыя сцен старажытных пабудоў: пляцень, абмазаны глінай. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [6], [8], [25] | Індывідуаль-нае і франтальнае апытанне |
| 2.2 | **Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі ў старажытны перыяд.**<br>Першыя формы мастацкай дзейнасці эпохі верхняга палеаліту: упрыгожванні ў форме арнаментаваных падвесак з біўня маманта, зубоў і касцей жывёл. Керамічныя пасудзіны эпохі палеаліту. “Палеалітычныя Венеры” – каменныя і касцяныя скульптурныя фігуркі, звязаныя з першабытнымі вераваннямі і культамі. Адлюстраванне магічных і прасторава-часавых уяўленняў першабытных часоў у дэкоры утылітарных прадметаў эпохі мезаліту. Геаметрызаваныя антрапаморфныя і зааморфныя выявы на косці і гліняных пасудзінах эпохі неаліту. Упрыгожванні з бурштыну. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асноўная [1], дадатковая [6], [8], [25] | |
| | Упрыгожванні бронзавага і жалезнага вякоў (дыядэмы, пярсцёнкі, бранзалеты, скроневыя кольцы, шкляныя пацеркі, завушніцы, фібулы): іх арнаментацыя (ямкі, трохвугольнікі, елкі, салярныя сімвалы і інш.). Кераміка жалезнага веку: Днепра-Дзвінская культура (Фіна-Угорскае паходжанне плямёнаў); Мілгарадска-Зарубінецкая культура (Скіфскае паходжанне); Штрыхавая культура (Балцкае паходжанне); Паморская культура (Гоцкае паходжанне). | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [6], [8], [25] | |
| | Тэхніка керамічных вырабаў. Формы керамікі: гаршкі (для прыгатавання гарачай ежы), збаны (для вадкасцяў), амфары (для перавозу прадуктаў), міскі, кубкі, слоікі (для засолкі агуркоў, захаванняварэння), друшлакі і інш. Вырабы з медзі, бронзы, железа, золата і серабра ў жалезным веку. З’яўленне каляровай эмалі ў пачатку н.э. З’яўленне манументальнай скульптуры ў пачатку н.э.: каменныя валуны з прыроднымі рэльефамі, скульптурныя антрапаморфныя слупы з каменя і дрэва. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [6], [8], [25] | Даклады |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **3** | **Мастацтва Беларусі IX–XIII стст.** | **8** | | **8** | | **2 с** | **17** | | |
| 3.1 | **Архітэктура Беларусі IX–XIII стст.** IX–XIII стст. – перыяд дзяржаўных утварэнняў: Тураўскае, Полацкае, Смаленскае княствы. Фарміраванне старажытных гарадоў на аснове гарадзішчаў жалезнага веку (Полацк, Віцебск, Лукомль і інш.). Радыяльна-кальцавая або радыяльна-веерная планіроўка гарадоў. Драўлянае будаўніцтва: жыллё, знешнія ўмацаванні, масты, вежы, гарадскія сцены. Бярвенчатае брукаванне вуліц. З’яўленне ў XI ст. новых будаўнічых матэрыялаў: плінфа, плітка для падлогі, вапна, цамянка, аконнае шкло, свінцовыя лісты для пакрыцця дахаў. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1] , дад. [11], [18], [25] | |
| | Усходні (візантыйскі) і заходнееўрапейскі ўплыў на беларускае мастацтва. Першыя агульнаеўрапейскія стылі ў беларускім дойлідстве: раманскі і гатычны. Культавае дойлідства. Полацкі Сафійскі сабор (сярэдзіна XI ст.) – адна з першых пабудоў культавай архітэктуры Беларусі: візантыйскі ўплыў і нацыянальныя асаблівасці. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18], [25] | |
| | Першыя нацыянальныя архітэктурныя школы: Полацкая і Гродзенская (XII ст.): іх характэрныя асаблівасці. Творчасць дойліда Іаана – галоўнага прадстаўніка Полацкай школы (Барысаглебская царква ў Навагрудку. Замкавая царква ў Мінску, цэрквы ў Ноўгарадзе і Смаленску). Асаблівасці кампазіцыі і дэкаратыўнага аздаблення помнікаў Гродзенскай школы (Спаса-Прэабражэнскі манастыр, Барысаглебская царква ў Гродне). | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18], [25] | Складанне фота- або відэапрэзентацыі |
| | Абарончыя збудаванні XIII ст. Вежы-данжоны ў Полацку, Брэсце, Тураве, Гродне, Навагрудку. Творчасць дойліда Алекса. «Белая» (Камянецкая) вежа. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18], [25] | Індывідуальнае і франтальнае апытанне |
| 3.2 | **Выяўленчае мастацтва Беларусі IX–XIII стст.** Фрэскавы жывапіс XI – XII стст. Роспісы Полацкага Сафійскага сабора, Спаса-Прэабражэнскай царквы і Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку. Мастацтва афармлення рукапісаў: мініяцюры, буквіцы, застаўкі, канцоўкі. Тэраталагічны або “звярыны” стыль у афармленні рукапісаў (“Аршанскае евангелле”, XIII ст.). Фарміраванне Полацка-Смаленскай школы мініяцюрнага жывапісу (XII–XIII стст.): Служэбнік Варлаама Хутынскага з выявамі Васіля Вялікага і Іаана Златавуста на залатым фоне; Універсітэцкае, Полацкае евангеллі. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18], [25] | |
| | Іканапіс. Тэхніка пісання старажытных ікон | | | | | 2 с | 1 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18] | |
| | Візантыйскія цудатворныя іконы Божай Маці на Беларусі: Полацкая Эфеска-Карсунская Адзігітрыя, Смаленская Адзігітрыя (XI ст.). Дарагабужская Адзігітрыя – | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. | Даклады |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | найбольш старажытны захаваны помнік іканапісу палеска-валынскага памежжа (мяжа XIII – XIV стст.). | | | | | | | [11], [18], [25] | |
| 3.3 | **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі IX–XIII стст.** Эвалюцыя керамічных вырабаў: разнастайнасць іх форм. Засваенне новых тэхнік: каляровая паліва, эмаль, ангоб. "Абварная" ("рабая") кераміка. Апрацоўка металаў і ювелірная справа. Крыжы-энкалпіёны. Пашырэнне тэхнікі коўкі з чорных металаў, здабытых з мясцовай балотнай руды (прадметы быту, зброя, дэталі конскай вупражы з упрыгожваннем насечкай, чаканкай, інкрустацыяй). | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18], [25] | |
| | Крыж Ефрасінні Полацкай (ювелір Лазар Богша, 1161 г.) – шэдэўр беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: сімволіка і сістэма аздаблення, тэхнікі разьбы па дрэве, інкрустацыі, перагародчатая эмаль. Лёс Крыжа Ефрасінні Полацкай, яго ўзнаўленне ў 1997 г. М.Кузьмічом. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [11], [18], [25] | Рэфераты |
| | **Усяго за семестр** | **18** | | **14** | | **2 л, 2 с** | **31** | | |
| | **2 курс, 3 семестр** | | | | | | | | |
| **4** | **Мастацтва часоў Сярэднявечча і Адраджэння (XIV–XVI стст.)** | **8** | | **8** | | | **14** | | |
| 4.1 | **Архітэктура Беларусі XIV–XVI стст.** Захаванне ўсходнееўрапейскага тыпу планіроўкі гарадоў. Фарміраванне замкаў з функцыяй цэнтра горада. Змены ў планіроўцы гарадоў XV ст. Гандлёвая плошча з ратушай як новы цэнтр горада. Узвядзенне брамаў у пачатку вуліц, што пераходзілі ў сувязныя дарогі паміж горадам і наваколлем (нясвіж, Быхаў). Замацаванне радыяльна-кальцавой сістэмы планіроўкі гарадоў (Пінск, Магілёў). Мястэчкі як дробныя паселічшы гарадскога тыпу. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | |
| | Абарончыя замкі: іх характэрныя рысы (Навагрудскі, Лідскі, Крэўскі, Гродзенскі). Мірскі замак: асаблівасці планіроўкі і канструкцыі, этапы будаўніцтва. Нясвіжскі замак – жамчужына беларускага дойлідства. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | Складанне фота- або відэапрэзен-тацыі |
| | Культавае дойлідства. Нацыянальныя рысы архітэктуры на аснове зліцця структуры руска-візантыйскага крыжова-купальнага храма і кампазіцыйна-канструкцыйных прыёмаў мясцовага замкавага дойлідства. Царква абарончага тыпу (царква-крэпасць), яе асаблівасці. Асноўныя помнікі. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | |
| | Спецыфіка архітэктуры беларускага Рэнесанса: буйнамаштабныя формы з малым выкарыстаннем архітэктурных дэталяў, шчыпцовы дах, спалучэнне чырвонага і белага ў дэкаратыўным аздабленні. Асноўныя помнікі: Замкавая вежа ў Нясвіжы, Мірскі замак, храм у Смаргоні Гродзенскай вобл., Праабражэнская царква ў Заслаўі. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | Тэст |
| 4.2 | **Выяўленчае мастацтва Беларусі XIV–XVI стст.** Развіццё фрэскавага жывапісу. Асаблівасці сюжэту і кампазіцыі. Трактоўка вобразаў святых і пракокаў. Народны характар тыпажу. Лінія – асноўны сродак | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | выразнасці ў фрэскавым жывапісу Сярэднявечча. Іканапіс. Імкненне да канкрэтызацыі і рэальнасці ў абранні выяўленчых матываў. Графічная мадэліроўка форм. Светлы каларыт і сістэма арнаментацыі фонаў. Іконы Пінскага Палесся (XVI ст.): “Успенне”, “Маці Божая Перыўлепта (Іерусалімская)”, “Спас Пантакратар”. Уплыў рэнесансу ў абразах “Спас” з Быценя, “Праскева Вялікапакутніца” са Случчыны. | | | | | | | [17], [18], [22], [24] | |
| | Свецкі жывапіс XIV–XVI стст. Партрэтнае мастацтва. Партрэты Кацярыны Слуцкай, віленскага біскупа Ежы Радзівіла. Скульптурны партрэт двух тыпаў: медальернае мастацтва і надмагільныя помнікі. Дзейнасць італьянскіх майстроў па аздабленні надмагілляў, вырабу манет і медалёў: Ф.Фларэнціец, Б.Берэчы, Дж.М.Моска (Падавана), Б.З. дэ Джыяноціс. Драўляная скульптура. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | Індывідуальнае і франтальнае апытанне |
| | Мастацтва мініяцюры. Афармленне евангелляў, летапісаў, псалтыроў (Лаўрышаўскае, Мелішаўскае, Жыровіцкае, Шарашоўскае евангеллі). Мініяцюры Радзівілаўскага (Кёнігсбергскага) летапісу. Народны тыпаж выяўляемых. Дынаміка і рух кампазіцый. Фарміраванне асноўных відаў, жанраў і тэхнік беларускай графікі. Развіццё кнігадрукавання. «Псалтыр» Ф.Скарыны. Тэхніка афармлення кніг («Песня Песняў» Ф.Скарыны). Кінавар. Гравюра на медзі. Творчая дзейнасць Т.Макоўскага. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | Калоквіум |
| 4.3 | **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XIV–XVI стст.** Узнікненне рамесных аб’яднанняў заходнееўрапейскага тыпу – цэхаў. Ювелірнае майстэрства: упрыгожванні, бытавы і літургічны посуд, абклады кніг і абразоў з каштоўных і каляровых металаў з ужываннем тэхнік чаканкі, ліцця, коўкі, гравіроўкі, чарнення, эмалі. Арнаментыка керамічных вырабаў. Узнікненне цэнтраў па вырабу шкла. Удасканальванне тыпаў і форм пасудзін. Драўляная мэбля беларускага Рэнесансу. | 2 | | | | | | Літаратура асн. [1], дад. [8], [11], [17], [18], [22], [24] | |
| | **Усяго за семестр** | **8** | | **8** | | | **14** | | **Залік** |
| | **2 курс, 4 семестр** | | | | | | | | |
| **5** | **Мастацтва беларускага барока** | **16** | | **20** | | | **32** | | |
| 5.1 | **Архітэктура беларускага барока** Рэфармацыя і Контррэфармацыя на Беларусі. Дзейнасць Радзівілаў. Зараджэнне новага стылю – барока. Творчасць італьянскага архітэктара Яна Марыі Бернардоні. Касцёл Божага Цела (Фарны) у Нясвіжы – першы твор у стылі барока на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Перыядызацыя беларускага барока: ранняе, сталае і позняе барока. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | |
| | Культавае дойлідства беларускага барока. Росквіт каталіцкага дойлідства. Ранняе барока: касцёл Адшукання Святога Крыжа ордэна бернардзінцаў і Дабравешчанскі касцёл ордэна брыгітак у Гродна. | 2 | | | | | | Літаратура асн. [1], дад. [16], [19], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | [26], [28] | |
| | Сталае барока: асаблівасці архітэктурна-планіровачнай структуры і дэкаратыўнага аздаблення. Касцёл Святога Міхаіла Архангела ордэна аўгусцінцаў у Міхалішках, царква Святога Мікалая ў Магілёве, касцёл Святога Францыска Ксаверыя ордэна езуітаў у Гродна, касцёл Святога Іосіфа ордэна бернардзінцаў у Мінску. Пінскі калегіум – яскравы помнік архітэктуры барока. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Тэст |
| | Адметныя асаблівасці сістэмы “віленскага барока”: дынамічныя формы фасадаў, фігурныя шчыты і хвалістыя лініі. Кафедральны Свята-Духаў сабор у Мінску, касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі езуіцкага ордэна ў Мінску, сабор Нараджэння Багародзіцы і Троіцкі касцёл ў Глыбокім, касцёл Святога Міхаіла Архангела ордэна францысканцаў у Івянцы, касцёл Святога Мікалая ордэна дамініканцаў ў Княжыцах, касцёл Святога Андрэя ў Слоніме. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | |
| | Творчасць архітэктара Я.К. Глаўбіца: Полацкі Сафійскі сабор, праекты касцёлаў Святога Казіміра, Святога Яна ў Вільні, Спаская царква ў Магілёве. Позняе барока ў культавым будаўніцтве, яго асаблівасці: касцёл Святога Станіслава ордэна кармелітаў у Магілёве, касцёл Унебаўзняцця Панны Марыі ордэна бернардзінцаў у Будславе, Петрапаўлаўскі касцёл у Барунах, касцёл Святога Міхаіла Архангела ў Лужках. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Індывідуаль-нае і франтальнае апытанне |
| | Драўляная культавая архітэктура барока XVIII ст. Дзве асноўныя тэндэнцыі развіцця: кансерватыўная (устойлівае захаванне мясцовых традыцый) і наватарская (адлюстроўвала працэс укаранення эстэтычных канцэпцый афіцыйных стыляў). Чатыры асноўныя кампазіцыйныя тыпы драўляных хрысціянскіх храмаў: падоўжна-восевы, цэнтрычны, глыбінна-прасторавы і крыжовы. | 2 | | | | | | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | |
| | Інтэнсіўнае развіццё гарадоў. Будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў. Змены ў горадабудаўніцтве. Ускладненне архітэктурна-планіровачнай структуры гарадоў, змены характару абарончых збудаванняў. Роля гандлёвай плошчы як цэнтра планіровачнай структуры горада. Радыяльная і рэгулярная сістэмы планіроўкі. Барока ў архітэктуры грамадскіх будынкаў. “Дом на рынку” і ратуша ў Нясвіжы, Магілёўская ратуша і інш. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Даклады |
| | Палацава-замкавае дойлідства. Гальшанскі і Смалянскі замкі, Палац Тызенгаўза, Новы замак у Гродне, замак Сапегаў у Ружанах, палацы Агінскіх у Слоніме, Радзівілаў у Дзятлаве, Валовічаў у Свяцку і інш. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [22], [23] | Рэфераты |
| | Інтэр'еры віленскага барока: паўкруглая і авальная форма залаў, маскіроўка вуглоў печамі, вертыкальныя крываліне́йныя панэлі, філёнчатыя дзверы, пазалота, люстэркі. Уклад у развіццё палацава-замкавага дойлідства архітэктараў саксонскай (М.Д. Пёпельман, І. Яўх, Я.С. Бекер) і італьянскай (А. Гену) школ. Садова-паркавае мастацтва. Паркі двух відаў: французскі рэгулярны і англійскі. Парк Радзівілаў у | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Складанне фота- або відэапрэзен-тацыі |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Нясвіжы, Гродзенскі парк. | | | | | | | | |
| 5.2 | **Выяўленчае мастацтва беларускага барока**<br>Імкненне да сінтэзу, арганічнага спалучэння ў адным ансамблі сродкаў розных відаў мастацтва, асэнсавання мастацкага асяроддзя як складанага адзінства багатых прасторавых кампазіцый. Аздабленне алтароў. Вядучая роля скульптуры ў выяўленчым мастацтве барока. Комплексы разьбяных драўляных алтароў Гродзенскага Езуіцкага і Пінскага Францысканскага касцёлаў. Тыповыя сюжэты скульптуры. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | |
| | Дэкаратыўная і мемарыяльная скульптура. Надмагіллі (Сіроткі ў Фарным касцёле ў Нясвіжы, віцебскага кашталяна Міколы Вольскага і яго жонкі Барбары ў Фарным касцёле ў Навагрудку). | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [26] | Даклады |
| | Іканастасы барока: багацце і пышнасць дэкаратыўнай аздобы, ужыванне пазалоты. Іканастасы Успенскай царквы Жыровіцкага манастыра і Магілёўскай Мікалаеўскай царквы. Дэкаратыўнае аздабленне царскіх варот: эвалюцыя ад плоскасных рэльефных узораў (Юр'еўская царква ў Віцебску) да гарэльефных з багатым ажурным дэкорам і жывапіснымі клеймамі (Сафійскі сабор у Полацку, Спаса-Прэабражэнскі сабор у Магілёве, Троіцкі касцёл у Ружанах). | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Індывідуаль-нае і франтальнае апытанне |
| | Познебарочныя храмавыя роспісы. Выкарыстанне прынцыпа "квадратур" (з ілюзіяй глыбіні кампазіцыі сродкамі перспектыўнага скарачэння архітэктурных куліс). Размалёўка Нясвіжскага касцёла Божага Цела (мастак К.Д.Гескі). | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [19], [22], [23], [26] | |
| | Станковы жывапіс. Сармацкі партрэт як аснова шляхецкай галерэі, абавязковая дэталь пахавальнай цырымоніі. Адлюстраванне мадэлі ў касцюме паводле нацыянальнай моды ў стандартнай застылай позе. Радзівілаўская калекцыя сармацкіх партрэтаў. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [22], [23], [26], [28] | |
| | Нясвіжскі "партрэтны збор" (мастак Ю.К.Гескі) – партрэты каралёў і знатных асоб. Партрэты віленскага мастака Б.Стробеля (партрэты Я.Радзівіла, Уладзіслава IV, У.Д.Астрожскага). | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [26], [28] | Рэфераты |
| | Кніжная і станковая гравюра. Тэхнікі дрэварыт і медзярыт. Творчасць магілёўскіх майстроў В.Вашчанкі, Ф.Ангілейка, А.Пігарэвіча. Творчасць віленскіх майстроў-гравёраў: К.Гётке, Л.Вілатц, Л.Кршчановіч, І.Шчырскі. Металагравюра ў творчасці братоў А. і Л.Тарасевічаў з Глуска: тытульныя гравюры і складаныя шматфігурныя цыклы ілюстрацый, партрэтна-эмблематычныя кампазіцыі і адлюстраванні цудатворных абразоў Божай Маці. Яскравыя помнікі беларускай барочнай металагравюры. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Тэст |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5.3 | **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларускага барока.** Творчасць беларускіх цанінікаў у Маскве (Ігнат Максімаў з Копысі, Пётр Заборскі, Сцяпан Іваноў (“Полубес”) з Мсціслава, Павел Буднееў, Драфейка, Якаў Андрэеў, Савелій Аляксееў, Пётр Фёдараў з Копысі і інш.). Аздабленне фрызаў і калон. Кампазіцыя “Вока паўліна” на сценах царквы Георгія Неакесарыйскага. Фрызы сабораў Новаерусалімскага, Іосіфа Варкаламскага манастыроў. Керамічнае пано з выявамі 4-х евангелістаў на барабане царквы Успення ў Ганчарах у Маскве. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | |
| | З’яўленне ткацкіх мануфактур ў XVII – пачатку XVIII стст. Габеленная тэхніка ў вытворчасці шпалер. Карэліцкія габелены. Слуцкія паясы. Мануфактура Яна Маджарскага. Двухбаковыя чатырохлікавыя паясы. Літыя паясы. Урэцка-Налібоцкае шкло: асартымент (падсвечнікі, бакалы, келіхі, бутэлькі, шклянкі, сталовыя сервізы), стылістычнае вырашэнне, тэхнікі. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [13], [16], [19], [22], [23], [26], [28] | Індывідуальнае і франтальнае апытанне |
| | **Усягo за семестр** | **16** | | **20** | | | **32** | | |
| | **3 курс, 5 семестр** | | | | | | | | |
| **6** | **Беларускае мастацтва канца XVIII – XIX стагоддзяў** | **8** | | **8** | | **2 л, 2 с** | **23** | | |
| 6.1 | **Архітэктура беларускага класіцызму** Станаўленне класіцызму ў канцы XVIII ст. Развіццё стылістыкі ад барочнага класіцызму да строгага стылю. Уплыў Варшавы на станаўленне стылю класіцызм. Творчасць архітэктараў Дж.Сака, І.Бэкера, К.Спампані. Росквіт палаца-паркавага мастацтва. Палац у Снове, палаца-паркавыя комплексы ў вёсцы Залессе, Румянцава-Паскевіча ў Гомелі, Тышкевіча ў Лагойску, дом-сядзіба В.Ваньковіча. Інтэр'еры класіцызму: змены анфіладнай планіроўкі на калідорную, манументальныя роспісы, абіўкі сцен, зімовыя сады. | 2 | | | | | 4 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | |
| | Змены ў горадабудаўніцтве. Увядзенне рэгулярнай сістэмы планіроўкі гарадоў (Віцебск). Дарожна-транспартнае будаўніцтва: чыгункі, «гасцінцы» –гандлёвыя дарогі міжнароднага значэння. Уплыў рускіх дойлідаў на беларускую архітэктуру. Горадабудаўнічае развіццё Мінска. Закладка Гарадскога парка. Вызначэнне галоўнай восі горада – вул.Захар'еўская і галоўнай плошчы. Архітэктура Верхняга горада. Мінскія прадмесці: Камароўка, Ляхаўка, Траецкае, Ракаўскае, Татарская слабада. | | | | | 2 с | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | |
| | Развіццё культавай архітэктуры. Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, Пакроўскі сабор у Віцебске, царква Нараджэння Багародзіцы манастыра базыльянак у Гродна, касцёл Святой Ганны ў Мосары, касцёл Святой Тэрэзы ордэна піяраў у Шчучыне, касцёл Святога Іосіфа ў Валожыне, сабор Святога Міхаіла Архангела ў Лідзе. Будаўніцтва грамадскіх будынкаў: гандлёвыя рады, школы, гімназіі, семінарыі, конна-паштовыя станцыі. Жыллёвае будаўніцтва. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6.2 | **Рэтраспектывізм у мастацкай культуры Беларусі**<br>Прычыны і вынікі з’яўлення гістарызму ў архітэктуры. Эклектыка ў мастацтве Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзях. З’явы стылізацыі і кампілятыўнага пераймання ў мастацтве. Рэтраспектыўныя стылёвыя накірункі ў беларускай архітэктуры: рэтраспектыўна-гатычны і рэтраспектыўна-рускі накірункі; неаготыка, неарускі стыль, неабарока, неакласіцызм, неараманіка.<br>Рэтраспектывізм у палацава-замкавай архітэктуры: Пішчалаўскі замак у Мінску, палац Пуслоўскіх у Косаве, палац Гатоўскага ў г. Чырвоны Бераг, палац Чапскіх у Прылуках, сядзіба графа Э.Гутэн-Чапскага ў Станькава. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], [5], дад. [8], [15], [22], [23], [26]] | |
| | Культавая архітэктура рэтраспектывізму.<br>Станаўленне рэтраспектыўна-рускага стылю. Рэтраспектыўна-рускі стыль і яго накірункі: 1) руска-візантыйскі; 2) маскоўска-яраслаўскі; 3) сінадальны.<br>Неарускі стыль у беларускай архітэктуры. Трансфармацыя старажытных архітэктурных форм, акцэнт на галоўных каштоўнасцях рускай нацыянальнай архітэктуры – эпічнасць, гераічная моц і размах, казачнасць і паэтычнасць. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | |
| | Рэтраспектыўная готыка ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Пераацэнка гатычнай архітэктуры на Беларусі. Абумоўленасць вяртання да готыкі панаваннем у грамадстве сентыментальна-рамантычнага светапогляду.<br>Неараманіка ў архітэктуры Беларусі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Цяжкія, закрытыя, масіўныя формы, статычная прыземленасць кампазіцыі, суровы абарончы характар, лаканізм і суровасць “рыцарскага” выгляду, умоўнасцю і абагуленасць дэкору. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| 6.3 | **Выяўленчае мастацтва канца XVIII – XIX стагоддзяў**<br>Іканапіс. Разны і ляпны арнамент як галоўны фон ікон. Росквіт іканапісных школ у другой палове XVIII ст.: брэсцкая, магілёўская, віцебская.<br>Росквіт станковага жывапісу. Віленская мастацкая школа. Францішак Смуглевіч як майстар вялікіх шматфігурных кампазіцый на гістарычную, рэлігійную і бытавую тэматыку, пейзажыст. Ян Рустэм як стваральнік гістарычных і бытавых кампазіцый, пейзажаў, сатырычных малюнкаў, гравюр, майстар жанравага партрэта. Творчасць Іосіфа Аляшкевіча. Спалучэнне класіцызму і рамантызму ў партрэтах мастака. Юзэф Пешка – польскі і беларускі партрэтыст і жывапісец гістарычнага жанру, яскравы прадстаўнік стылю класіцызм у выяўленчым мастацтве. Ян Дамель – буйнейшы прадстаўнік беларускага гістарычнага жывапісу першай паловы XIX ст. Валенцій Ваньковіч: творчы шлях ад акадэмічнага класіцызму праз рамантызм і сентыменталізм да рэалістычнага адлюстравання жыцця. Творчасць Напалеона Орды. Канстанцін Кукевіч – адзін з найбольш яскравых прадстаўнікоў бытавога жанра ў беларускім жывапісе першай паловы XIX ст. | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Уплыў Пецярбургскай мастацкай школы на развіццё беларускага мастацтва. Нікадзім Сілівановіч – беларускі жывапісец XIX ст., выдатны каларыст і рысавальшчык, яскравы прадстаўнік бытавога жанру і партрэта, рэаліст. Іван Хруцкі – прадстаўнік беларускага партрэтнага жывапісу XIX ст., заснавальнік класічнага нацюрморта. Казімір Альхімовіч – буйны прадстаўнік беларускага гістарычнага жывапісу XIX ст. Вітольд Бялыніцкі-Біруля як выдатны прадстаўнік жанру пейзаж. | | | | | 2 л | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | |
| | Скульптура. Дзве буйныя школы скульптуры: віленская і маскоўская. Кароль Ельскі як скульптар-монументаліст. Казімір Ельскі – яскравы прадстаўнік класіцызму.. Рафаэль Слізень як майстар медальёнаў і барэльефаў культурных дзеячоў эпохі. Ян Астроўскі як майстар камернай скульптуры (медальёны ў гіпсе) і партрэтыст. Творчасць Алены Скірмунт. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 3 |
| 6.4 | **Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва канца XVIII – XIX стагоддзяў**<br>Ювелірная справа і апрацоўка металаў. Кераміка. Дзве школы паліванай кафлі XVIII ст.: Полацкая і Віцебская. Галандскія ўзоры як аснова распісной кафлі. Вырабы фаянсавых мануфактур у Свержані і Целяханах. Мастацкае шкло. Выраб люстэрак на мануфактурах ва Урэччы і Налібаках. Ткацтва. Шаўковая і залотная тканіна. Тэхніка “points rentrés”. Ткацкія мануфактуры ў Ружанах і Гродне. Вышыўка біццю і каніцеллю. Вышыўка гладдзю. | | | 2 | | | 3 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [15], [22], [23], [26] | Рэфераты |
| | **Усяго за семестр** | **8** | | **8** | | **2 л, 2 с** | **23** | | **Экзамен** |
| | **3 курс, 6 семестр** | | | | | | | | |
| **7** | **Мастацтва Беларусі XX ст.** | **8** | | **10** | | **2 л, 2 с** | **22** | | |
| 7.1 | **Архітэктура Беларусі XX ст.**<br>Стыль мадэрн, яго нацыянальныя асаблівасці. Ранні мадэрн, яго асаблівасці. Творчыя тандэмы архітэктараў і скульптараў: С.Шабунеўскага і П.Яцыны, Г.Гая і Я.Тышынскага. Сувязь дэкора з канструкцыяй. Сталы мадэрн: рэгіянальныя праявы (выкарыстанне каменя-валуна, спалучэнне каменнай і цаглянай муроўкі, гладкай і фактурнай тынкоўкі).<br>Узрастанне ролі грамадскіх будынкаў у сістэме горадабудаўнічых вырашэнняў. Будаўніцтва стадыёнаў, тэатраў, клубаў, грамадскіх палацаў, гасцініц. Аднатыповасць вырашэнняў будынкаў банкаўскіх кантор.<br>Стварэнне праектнага інстытута “Белдзяржпраект” (1933 г.). Распрацоўка генпланаў Магілёва, Оршы і Мазыра, Полацка, Слуцка і Рэчыцы. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [10], [15], [22], [23] | Стварэнне фота- або відэапрэзен-тацыі |
| | Канструктывізм і неакласіцызм у архітэкутры Беларусі. Творчасць І.Лангбарда і Г.Лаўрова.<br>Змены горадабудаўнічай стратэгіі ў 1940-х гг. Генплан развіцця Мінска (1944–1946 | 2 | | | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [10], [15], | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | гг.). Забудова галоўнай восі Мінска – вул. Савецкай (сучасны праспект Незалежнасці). Творчасць архітэктараў М.Паруснікава, І.Лангбарда, М.Колі, У.Караля, А.Воінава, М.Баршча, Г.Заборскага. Развіццё ідэі “аплікатыўнай” архітэктуры: “прыстаўкі” класічных порцікаў да будынкаў, ужыванне арнаменту, запазычанага з народнага дэкаратыўнага мастацтва. | | | | | | | [22], [23] | |
| | Генплан развіцця Мінска 1965 г. (арх. Л.Гафо, Я.Заслаўскі, А.Наканечны, І.Люблінскі, Н.Кудзінаў, Н.Трахтэнберг): ідэя стварэння рукатворнага ландшафту. Канцэпцыя генеральнага плана развіцця Мінска 1982 г. (да 2000 г., кір. Ю.Пурэцкі). Забудова новых раёнаў з максімальным выкарыстаннем рэльефа і акаляючых лясных масіваў. Будаўніцтва мікрараёнаў. Функцыянальны падыход у грамадзянскай архітэктуры. Тыпавое праектаванне. Узбуйненне маштаба забудовы вялікіх гарадоў. Постмадэрнізм у архітэктуры Беларусі. | | | 2 | | | 2 | Літаратура асн. [1], дад. [8], [10], [15], [22], [23] | Даклады |
